№ 11 (561) 20 сакавіка 2008

www.nn.by

# Наша Ніва

ПЕРШАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЭТА

ISSN 1819-1614

Заснаваная ў лістападзе1906. Адноўленая ў траўні 1991. Выдавец: Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы». Выходзіць штотыднёва, у чацьвяргі

Спэцыяльны нумар «НН» да 90-годзьдзя Беларускай Народнай Рэспублікі. Старонкі 2—14.

## Пажывём у БНР?




PHOTO.BYMEDIA.NET

## У НУМАРЫ

### Беларусь наняла піяршчыка Беразоўскага

Акрамя апальнага расейскага алігарха, кліентамі Тыматы Бэла былі Маргарэт Тэтчэр, а таксама манархія Саудаўскай Арабіі. **Старонка 15.**

### Аўтаінспэктары паплаціліся пасадамі за «жывы шчыт»

Скандальны выпадак узьняў праблему стаўленьня да чалавечага жыцьця і прыватнай уласнасьці ў нашай краіне. **Старонка 18.**

### Пунсавее Тыбэт

Ёсьць тэмы, асабліва нелюбімыя палітыкамі — і на Ўсходзе, і на Захадзе. Пэрыфразуючы Кіплінга, у гэтым яны могуць сысьціся. Піша Віталь Тарас. **Старонка 24.**

## Крах даляра

На міжнародным рынку пабіты новы гістарычны рэкорд — курс даляра да эўра падступіў да 1,6. Шэсьць гадоў таму даляр каштаваў удвая болей. Фінансавы крызыс называюць «самым балючым з моманту заканчэньня другой сусьветнай вайны». **Старонка 20.**

## Сёньня — астранамічная вясна

Вясна ў Беларусі ўступіла ў свае законныя правы 20 сакавіка ў 7 гадзін 48 хвілін паводле менскага часу.

Паводле астранамічнага календара, менавіта ў гэты дзень Сонца, рухаючыся па экліптыцы, дасягне пункту вясновага раўнадзенства.

Натуральна, што астранамічная вясна наступае толькі ў паўночным паўшар'і. Беларусы Аўстраліі, Аргентыны, Бразыліі сустракаюць заўтра астранамічную восень. Да таго ж у Буэнас-Айрэсе заўтра +30, у аўстралійскім Сыднэі «крыху» халадней — +28 °C.

### ЭКСКУРСІЯ

## Па мясьцінах БНР

**22 сакавіка**, адбудзецца экскурсія па памятных мясьцінах БНР **у Менску**. **Пачатак а 12-й, збор ля помніка Янку Купалу.**

### ВЯЛІКДЗЕНЬ

# Набажэнствы ў менскіх храмах

## Рыма-каталікі

**Архікатэдра** (пл.Свабоды, 9)
*Вялікая субота (22 сакавіка)*
На працягу дня — адарацыя Езуса ў грабніцы. Асвячэньне велікодных страваў. 21.45 — Пасхальная вігілія (Мітрапаліт Т.Кандрусевіч, просты этэр на БТ). Начная адарацыя.
*Велікодная нядзеля (23 сакавіка)*
7.00 — працэсія з Найсьвяцейшым Сакрамэнтам і Рэзурэкцыя. Асьвячэньне страваў. 11.30, 13.00, 18.30 — сьв.Імшы.

**Касьцёл Найсьвяцейшай Тройцы на Залатой Горцы** (пр.Незалежнасці, 44а)
*Вялікая субота*
На працягу дня — адарацыя Езуса ў грабніцы. Асьвячэньне страваў. 22.00 — вігілія.
*Велікодная нядзеля*
7.00 — Рэзурэкцыя. 9.00 — урачыстая сьв.Імша.

**Касьцёл Узвышэньня Сьв.Крыжа (Кальварыя)** (Кальварыйскі праезд, 1)
*Вялікая субота*
На працягу дня — адарацыя Езуса ў грабніцы. Асьвячэньне страваў. 21.00 — вігілія.
*Велікодная нядзеля*
6.30 — Рэзурэкцыя. 10.00, 13.00 — сьв.Імшы.

**Чырвоны касьцёл** (пл. Незалежнасці, 15)
*Вялікая субота*
На працягу дня — адарацыя Езуса ў грабніцы. Асьвячэньне страваў. 21.00 — вігілія.
*Велікодная нядзеля*
8.00 — Рэзурэкцыя. 9.00, 10.00, 11.00, 13.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00 — урачыстыя сьв.Імшы

**Парафія Сьв.Яна Хрысьціцеля** (вул. Пляханава, 28)
*Вялікая субота*
На працягу дня — адарацыя Езуса ў грабніцы. Асьвячэньне страваў. 20.30 — вігілія. Начная адарацыя.
*Велікодная нядзеля*
7.00 — працэсія з Найсьвяцейшым Сакрамэнтам і Рэзурэкцыя. Пасьля сьв.Імшы — асвячэньне страваў на велікодны стол. 08.30, 10.00, 11.45, 13.00, 18.30 — сьв.Імшы

**Парафія Сьв.Антонія** (пр-т «Газеты «Звязда», 18, памяшканьне ЖЭСу № 84)
*Вялікая субота*
10.00—12.00, 19.00 — асьвячэньне страваў. 20.00 — вігілія.
*Велікодная нядзеля*
8.00 — Рэзурэкцыя. 11.00, 19.00 — урачыстыя сьв.Імшы

## Грэка-каталікі

*Вялікі чацьвер*
18.30 — Урачыстая служба ў дольнай залі Чырвонага Касьцёлу.
*Велікодная нядзеля*
24.00 — урачыстая служба пры галоўным алтары Чырвонага касьцёлу. Усяночная, а пад раніцу — асьвячэньне страваў.

## Пратэстанты

**Хрысьціяне веры эвангельскай** ладзяць набажэнствы ў сваім храме (вул.Гурскага, 48) у нядзелю а 9–й і 12–й.

**Вернікі царквы «Ян Прадвесьнік»** сьвяткуюць Вялікдзень у нядзелю а 16–й, таксама ў царкве на Гурскага, 48.

### АД РЭДАКЦЫІ

# Хто запаліць ліхтар

Стоячы колькі дзён таму ў чарзе ў краме, заўважыў на паліцы пляшку пеністага віна «Князь Витовт». У галаве нечакана пранеслася: «Халера, нічога не зьмянілася!» Памяць перанесла мяне ў апошнія мае студэнцкія дзянькі. Злы праз абсалютна ніякую арганізацыю сьвяткаваньня 85-й гадавіны БНР ды агульную бездапаможнасьць гарадзенскай апазыцыі, я пайшоў у кампаніі брата і сябра адзначаць Дзень Волі прыватным чынам.

Дзеля сьвяткаваньня выбралі вуліцу Багдановіча, набыўшы папярэдне ў краме пляшку пеністага «Вітаўта» (хацелася, бач ты іх, сымболікі!). Да «Вітаўта», якога прадавачка спачатку «не знайшла» («нет у нас «Вит*а*ута», есть только «Вит*о*вт»), набылі шакаладку «Эўравіта» (на мову афармленьня ўжо не зважалі, кіраваліся найперш назвай).

Селі пад ліхтаром, які не гарэў. Наўмысна, каб сьвята не сапсаваў патруль, якіх у той дзень было як ніколі шмат. Але страх, назапашаны цягам апошніх неспакойных дзён, не пакідаў нас, пакуль не ўзяліся адкаркоўваць пляшку. Корак, нечакана стрэліўшы, нячутна паляцеў у бок незапаленага ліхтара. І той раптам засьвяціўся зыркім сьвятлом. А наш страх адразу некуды зьнік. Рэшту вечару мы правялі ў марах пра тое, як будзем сьвяткаваць Дзень Волі празь пяць гадоў. Памятаю, як нават і думаць не хацелася, што 90-ю гадавіну Беларускай Народнай Рэспублікі мы будзем адзначаць усё пры той жа ўладзе.

У чарзе пасярод крамы мне падумалася, а ці зьмянілася за гэтыя пяць гадоў хоць нешта ў тым, як мы сьвяткуем ці ня самы значны для кожнага народу дзень — Дзень незалежнасьці. Прыгадалася, як тая глыбокая незадаволенасьць 2003 годам вылілася ў трохі наіўны артыкул, надрукаваны ў «Нашай Ніве» перад Днём Волі-2005, у якім я патрабаваў сьвята ў гэты дзень. Як было дзіўна і прыемна праз тыдзень пабачыць на галоўнай плошчы Горадні па-сьвяточнаму апранутых месьцічаў з кветкамі і балёнікамі ў руках і ўсьмешкамі на тварах. Іх было няшмат, але яны былі і выклікалі ў сустрэчных шмат пытаньняў і цікавасьці: «Што гэта за сьвята сёньня такое?»

2006 год запомніўся стракатым людзкім морам вакол помніка Купалу ў Менску і брутальным разгонам каля тэатру Музкамэдыі. У турмах сядзелі сотні людзей і гэта, зразумела, не спрыяла сьвяточнаму настрою ў большасьці дэманстрантаў, а міліцыянты і пагатоў не былі настроеныя на сьвята.

Дзень Волі 2007 засеў у памяці бел-чырвона-белымі стужкамі ў бярозавым гольлі побач з Петрапаўлаўскай царквой на Нямізе ды манэўрамі вайскоўцаў побач з цыркам. Да людзей, якія ўсё ж выйшлі на вуліцу, не зважаючы на стому ад палітыкі і палітыкаў, вярнуўся сьвяточны настрой.

Сёлетняя дата, відавочна, вымагае адпаведных высілкаў ад зацікаўленых людзей. І пэўны прагрэс заўважны: нарэшце нехта ўзяўся за няўдзячную, але такую патрэбную працу — выпуск паштовак і календароў, музычных зборнікаў. Пачала рэалізоўвацца неймаверная, здавалася б, у нашых умовах ідэя агульнанацыянальнай дыктоўкі. Няхай гэта выходзіць не заўсёды гладка, але пачатак пакладзены.

Гадавіну БНР, нарэшце, адсьвяткавалі на самым высокім узроўні ў Эўрапарлямэнце. За межамі гэтую падзею адзначаюць ня толькі беларусы — палякі адсьвяткуюць 25-га ў знак салідарнасьці з усходнімі суседзямі.

Ня варта чакаць звышнатуральнага ад хуткага ўжо 25 Сакавіка. Тым больш, што сьвята гэтае пакуль ня выйшла за межы кола абазнаных і неабыякавых беларусаў. Хоць некаторыя незалежныя сайты і стварылі атмасфэру, у якой міжволі пачынаеш верыць, што «да сьвята рыхтуецца ўся краіна». Для таго, каб гэта стала сапраўды так, а нашая мара пра 95-я ўгодкі стала явай, трэба працягваць запальваць ліхтары — друкаваць паштоўкі, выдаваць кнігі... І выводзіць пад сьвятло нашага ліхтара іншых.

**Сямён Печанко**

# Пажывем у БНР?

Ці можна спадзявацца, што на месцы сёньняшняй Рэспублікі Беларусі некалі зноў паўстане Беларуская Народная Рэспубліка? Ці можа гістарычны ідэал БНР праз пэўны час стацца палітычным праектам? Ці гэта толькі фантазіі? БНР — гэта мінулае ці будучыня? Ці хацелі б Вы пажыць у БНР? Адказваюць юрысты, гісторыкі, пісьменьнікі, палітыкі, чытачы «Нашай Нівы».

Лідэр «Руху «За свабоду» **Аляксандар Мілінкевіч** нядаўна быў у Страсбургу, дзе ўдзельнічаў у «Тыдні Беларусі». Там экс-кандыдат на пасаду прэзыдэнта меў некалькі размоваў з старшынёй Рады БНР Івонкай Сурвіллай. Вось што Мілінкевіч вынес з гэтых гутарак: «Пытаньне дзяржаўна-прававога ладу ў пост-дыктатарскай Беларусі вельмі важнае. Трэба ўлічваць, што цягам амаль стагодзьдзя дэмакратычнае канстытуцыйнае права прасунулася далёка наперад. Мы, відавочна, павінныя шанаваць неўміручыя ідэалы БНР і яе заснавальнікаў. Дэмакратычна абраны беларускі парлямэнт абавязкова павінен прызнаць Раду БНР як урад у выгнаньні, які цягам дзесяцігодзьдзяў захоўваў беларускую дзяржаўніцкую традыцыю і нацыянальны дух. Трэба будзе прапанаваць усім сябрам Рады стаць грамадзянамі Беларусі. Але, на маю думку, недастаткова мэханічна абвясьціць дэмакратычную Беларусь Беларускай Народнай Рэспублікай. З маіх размоваў у Страсбургу з старшынёю Рады БНР спн.Івонкай Сурвіллай я зразумеў, што ўрад БНР з радасьцю перадасьць свае паўнамоцтвы дэмакратычнаму беларускаму ўраду, які зможа рэальна гарантаваць незваротнасьць незалежнасьці і эўрапейскага — бо іншага няма — выбару Беларусі. Патэнцыял і досьвед Рады БНР будуць нам вельмі патрэбныя».

### БНР перадасьць паўнамоцтвы РБ

Стваральнік Беларускай хрысьціянскай дэмакратыі **Павал Севярынец** прызнаецца, што хоча пажыць у БНР. «Трэба спадзявацца, што пераход РБ у БНР некалі ўсё ж адбудзецца. Для людзей, якія вераць у Бога, імкненьне да ідэалу ёсьць сэнсам жыцьця. Я веру, што такі пераход адбудзецца мірным шляхам, праз абуджэньне народу, як гэта ўжо неаднаразова бывала ў нашай гісторыі. Дастаткова толькі групы людзей, якія б у гэта верылі. Асабіста я мару пажыць у БНР, якая б увасобілася ў сёньняшняй Беларусі», — кажа Павал Севярынец.

Падобнае меркаваньне мае і намесьнік старшыні Партыі БНФ **Аляксей Янукевіч**. «Спадзяюся, што зь цягам часу ўзьнікне такая сытуацыя, што ўрад БНР перадасьць свае паўнамоцтвы дзейснаму ўраду Беларусі. Я перакананы, што Беларусь рана ці позна мусіць стаць на шлях свабоды, каб рэалізаваць усе ідэалы і каштоўнасьці БНР. Мне падаецца цалкам рэальным тое, што абвяшчэньне БНР замест сёньняшняй РБ магло б адбыцца, але пра гэта пакуль рана разважаць. Асабіста мне, безумоўна, хацелася б пажыць у БНР».

### Немагчымае збываецца

Чытач «Нашай Нівы» з Заслаўя **Павал Клімчык** лічыць, што нічога немагчымага няма, і ў адзін дзень мы зноў можам прачнуцца ў БНР. «Кожны сьвядомы грамадзянін Беларусі хацеў бы жыць у краіне, дзе ўшаноўваюцца нацыянальныя традыцыі, а гісторыя не перапісваецца на новы капыл з прыходам новых кіраўнікоў. У цяперашніх палітычных рэаліях спадзявацца на цуд вяртаньня да БНР не даводзіцца, але ж выключаць такую магчымасьць нельга. Падзеі 1918 году — прыклад, як немагчымае амаль імгненна можа ўвасобіцца ў рэальнасьць. Трэба любіць сваю краіну, даносіць да іншых людзей высокія ідэалы БНР, і тады, я веру, што можа ўсё ўдацца».

### Контурныя карты

Больш пэсымістычны юрыст **Юры Чавусаў**. На ягоную думку, ня варта засяроджвацца на марах мінулага, а засяродзіцца на сёньняшняй РБ, якая існуе рэальна. «Новае абвяшчэньне БНР нерэальнае з палітычнага пункту гледжаньня. РБ пасьпела ўвасобіцца, як рэальная дзяржава з усімі атрыбутамі. Я трымаюся кансэрватыўных поглядаў, таму лічу, што будаваць дэмакратычную краіну будзе лепш на яе грунце. Удасканальваць тое, што ўжо маем. Гэта добра ў дзяцінстве маляваць контурныя карты і мроіць пра БНР ці пра нешта яшчэ, але трэба рэальна глядзець на рэчы. Я тут прытрымліваюся словаў Канта, які казаў: «Усё сапраўднае разумнае, усё разумнае сапраўднае», — кажа Ю.Чавусаў.

### Акт, скіраваны ў будучыню

Гісторык **Анатоль Сідарэвіч** перакананы, што актам 25 Сакавіка стваральнікі Беларускай Народнай Рэспублікі пакінулі нам вялікую працу на будучыню. «Мне падаецца, што двойчы ўвайсьці ў адну і тую ж раку немагчыма. Шчыра кажучы, я не хацеў бы, каб у пост-РБэшнай Беларусі рабілася нешта падобнае, як у Менску ў 1917 ці 1918 годзе. Разам з тым, нам трэба імкнуцца да тых правоў і каштоўнасьцяў, якія былі замацаваныя ва Ўстаўных граматах БНР. Некалькі гадоў таму ў «Нашай Ніве» я друкаваў артыкул Антона Луцкевіча «Аб свабодах». Скажыце, ці маем мы хоць адну з тых свабодаў сёньня? Нам да іх яшчэ вельмі далёка! Некалі доктар Язэп Сажыч казаў, што ўрад БНР перадасьць свае паўнамоцтвы ўраду Беларусі тады, калі ў краіне адбудуцца вольныя парлямэнцкія выбары. Я ня ўпэўнены, што нам трэба вяртацца да назвы Беларуская Народная Рэспубліка, да гэтага не вярнуліся ні Літва, ні Ўкраіна. Затое існуе Кітайская Народная Рэспубліка. Натуральна, што БНР зь яе Ўстаўнымі граматамі — гэта заданьне нам на заўтра. Акт, які скіраваны ў будучыню».

Працяг на старонцы 4.

# Пажывем у БНР?

Працяг са старонкі 3.



## Ідэалы на тое і ідэалы

Яшчэ адзін чытач «НН» **Янка Марозаў** (мы тэлефанавалі першым-лепшым падпісчыкам) лічыць, што досьвед БНР у любым выпадку будзе карысным для нашай краіны: «БНР — важная частка нашай гісторыі і сучаснасьці. Гэта памяць, якую нельга занядбаць і досьвед, які варта прымяніць. Ідэалы на тое і ідэалы, што іх немагчыма напоўніцу рэалізаваць у рэчаіснасьці. Марксізм таксама быў геніяльнай утопіяй, і мы ўсе ведаем, што з гэтага ўдалося. Можа стацца, што БНР некалі стане не гістарычным, а палітычным праектам, але не напоўніцу, а ў пэўнай частцы. Напрыклад, ідэя, каб орган выканаўчай улады называўся Радай, вельмі мне імпануе».

Першы рэдактар адроджанай «Нашай Нівы» **Сяргей Дубавец** мяркуе, што БНР назаўсёды будзе для беларусаў ідэалам дзяржавы, да якой трэба імкнуцца, а РБ у нейкім сэнсе ўжо сёньня зьяўляецца ўвасабленьнем палітычнага праекту БНР: «Што такое БНР? Гэта ідэал або эталён сучаснай незалежнай беларускай дзяржавы, абстрактнае панятак «нацыянальнай мэтралёгіі», якім вывяраецца адпаведнасьць той дзяржавы, у якой мы жывем, ідэальнай велічыні. Ствараецца такі эталён аднойчы і назаўжды, каб мы заўсёды маглі праверыць, наколькі наша дзяржава сучасная, беларуская і незалежная. Ані БССР, ані РБ, ані тое, што будзе заўтра, ня сталі і ўжо ня стануць новымі пунктамі адліку ці пунктамі праверкі, «новымі сантымэтрамі» пасьля Акту 25 Сакавіка 1918 г. Аднак і эталён на тое й дадзены, каб ніколі да канца не ўвасобіцца ў рэальнасьці. БНР — сыстэма вымярэньня для РБ, а ня тое, што мелася б паўстаць «на яе руінах». Ідэал БНР стаў палітычным праектам. І РБ — этап гэтага праекту. Іншая рэч, што да ідэалу яму далёка. Спадзявацца трэба на тое, што цяперашняя дзяржава будзе рабіцца больш сучаснай, незалежнай і беларускай».

## Назвы не прынцыповыя

Пісьменьнік **Уладзімер Арлоў** лічыць, што рэалізацыя ідэяў БНР зусім ня страціла сваёй актуальнасьці, а яшчэ большае гучаньне яно набывае ў пытаньні вяртаньня Беларусі ў аб'яднаную Эўропу. «У маім уяўленьні БНР была мадэльлю дэмакратычнай эўрапейскай дзяржавы, і рэалізацыя яе ідэі ня страціла сваёй актуальнасьці да сёньня. Наадварот, толькі набыла моц. Гістарычна і мэнтальна — беларусы эўрапейцы, і яны абавязкова мусяць вярнуцца ва ўлоньне агульнаэўрапейскай цывілізацыі. Гэта пачынаюць разумець усё больш і больш людзей, і ня толькі ў Беларусі, але і ў самой Эўропе, што даказаў нядаўні «Тыдзень Беларусі» ў Страсбургу. Вацлаў Гавал нядаўна сказаў, што ня бачыць завершанай канфігурацыю аб'яднанай дэмакратычнай Эўропы безь Беларусі і Украіны. Калі мы гаворым пра назвы, то мне не падаецца, што гэта самае прынцыповае пытаньне. Я думаю, што і краіна пад назвай «Рэспубліка Беларусь» можа цалкам рэалізаваць тыя ідэалы, якія засталіся нязьдзейсьненымі з 1918 году», — кажа У.Арлоў.

**Зьміцер Панкавец**

# Дзень Волі — 2008

## 25 Сакавіка Беларусь адзначае 90-ю гадавіну абвяшчэньня незалежнасьці Беларускай Народнай Рэспублікі

З гэтай нагоды ў нашай краіне, а таксама па-за яе межамі пройдуць сьвяточныя мерапрыемствы — ад шэсьцяў і мітынгаў, канцэртаў і ўрачыстых вячэраў да спартовых турніраў. Адмыслова да гэтай даты былі надрукаваныя юбілейныя сэрыі паштовак, кніга і каляндар. Упершыню ў гонар сьвята з ініцыятывы палітоляга Ўладзімера Падгола будзе зладжаная агульнанацыянальная дыктоўка.
Прапануем Вашай увазе анонсы некаторых сьвяточных імпрэзаў.

## Шэсьце ў Менску

Сёлета правядзеньне акцыі на Дзень Волі плянуецца па новым маршруце. Збор а 18.00 на плошчы Якуба Коласа, шэсьце па праспэкце Незалежнасьці, вуліцах Валадарскага і Гарадзкі Вал. Канчатковым пунктам мусіць стаць помнік Максіму Багдановічу, што ля Опэры. Цягам акцыі арганізатары плянуюць ускласьці кветкі да помнікаў Якуба Коласа, Янку Купалу, Адаму Міцкевічу і Максіму Багдановічу. Заяўнікамі вулічнай акцыі выступілі Аляксандар Мілінкевіч, Лявон Баршчэўскі, Анатоль Лябедзька і Мікола Статкевіч. Адказу на сваю заяўку з гарвыканкаму яны не атрымалі, але Л.Баршчэўскі сказаў на прэзэнтацыі кнігі І.Сурвіллы: «Месца сустрэчы зьмяніць нельга».

## Выстава твораў Яўгена Куліка

19 сакавіка ў Палацы мастацтваў (Казлова, 3) адкрылася выстава выдатнага мастака, аўтара эталёну герба «Пагоня» Яўгена Куліка. Кулік (1937—2002) быў выдатным графікам. А яшчэ гэты чалавек быў адным з арганізатараў руху за незалежнасьць Беларусі, спачатку падпольнага, які з часам вырас у стварэньне Народнага Фронту і абвяшчэньне суверэнітэту краіны.

Выстава называецца «Гістарычная графіка», і на ёй будзе прадстаўлена 80 працаў мастака. Гэта выявы старасьвецкіх замкаў і сядзіб, увасобленыя ў графіцы постаці князёў і ўладароў Беларусі, кніжныя ілюстрацыі.

Арганізатар выставы — суполка «Пагоня» Саюзу мастакоў. Алесь Марачкін падкрэсьлівае, што выстава Куліка прысьвечана 90-годзьдзю БНР.

Сябар Я.Куліка і суаўтар эталёну «Пагоні» Ўладзімер Крукоўскі адзначае, што на выставе няма слабых і сярэдніх твораў. Асаблівую ўвагу сп.Крукоўскі раіць зьвярнуць на малавядомыя шырокай публіцы ілюстрацыі да «Слова пра паход Ігараў», а таксама на слынныя ілюстрацыі да «Песьні пра зубра» Міколы Гусоўскага. Менавіта на форзацы гэтай кнігі ў 1980 годзе ўпершыню ў паваеннай гісторыі Беларусі цалкам легальна вялікім накладам зьявілася выява «Пагоні».

**НБ**

### Футбольны турнір у Берасьці...

У Берасьці 90-годзьдзе абвяшчэньня Беларускай Народнай Рэспублікі адзначаць турнірам па міні-футболе. У адборачным туры ўзялі ўдзел сем камандаў — дружыны рэгіянальных партыйных структураў, незалежных прафсаюзаў і грамадзкіх арганізацый. Агулам — больш за 60 удзельнікаў.

Паводле вынікаў першага этапу чатыры каманды 22 сакавіка пазмагаюцца ў фінале «Кубка Незалежнасьці», заснаванага абласным аргкамітэтам па сьвяткаваньні юбілею.

### ...і Магілёве

Адбудзецца турнір па міні-футболе сярод аматарскіх камандаў гораду. Сярод месьцічаў зладзяць распаўсюд літаратуры пра Беларускую Народную Рэспубліку. Вечарам 25 сакавіка будзе арганізаваная вечарына з бардаўскім канцэртам для моладзі.

### Мітынг, шэсьце і канцэрт у Жодзіна

Прадстаўнікі дэмакратычных сілаў Жодзіна плянуюць зладзіць сьвяточныя мерапрыемствы 23 сакавіка. Плянуецца, што сьвяточны мітынг пачнецца а 15-й гадзіне каля гарадзкога парку адпачынку. Пасьля мітынгу адбудзецца сьвяточнае шэсьце з ускладаньнем кветак да абэліска палеглым героям Беларусі. Увечары заплянаваны ўрачысты канцэрт з удзелам беларускіх музычных гуртоў. На сьвята запрошаныя прадстаўнікі гарадзкіх уладаў.

### Радыёвіктарына

Ад 10 да 25 сакавіка на сайце радыё «Рацыя» (http://www.racyja.com) адбываецца віктарына. Наведнікі сайту мусяць адказаць на нескладанае пытаньне па гісторыі Беларускай Народнай Рэспублікі, даслаць першымі правільны адказ на адрас рэдакцыі. Пераможца вызначаецца штодня і атрымлівае адмысловы прыз — музычную складанку «НезалежныЯ» з аўтографамі ўлюбёных выканаўцаў.

Альбом прысьвячаецца 90-м угодкам абвяшчэньня БНР і будзе выдадзены акурат да 25 Сакавіка.

### Онлайн-канфэрэнцыя з айцом Аляксандрам Надсанам

25 Сакавіка апостальскі візытатар для беларусаў-каталікоў замежжа адкажа он-лайн на пытаньні чытачоў сайту nn.by. Пачатак а 12-й гадзіне.

### «Пагоня»

22 сакавіка а 18-й на сядзібе БНФ — адкрыцьцё юбілейнай выставы творчай суполкі «Пагоня».

### Сьвяточны канцэрт Вайцюшкевіча

25 сакавіка ў менскім клюбе «Графіці» (зав.Калініна, 16) пройдзе «Сьвяточны канцэрт» Зьмітра Вайцюшкевіча. Пачатак у 20.00. Даведкі па т.: (029) 254-49-09.

# Эўропа прызнала БНР

Упершыню Беларускі тыдзень у Эўрапарлямэнце быў такім рэпрэзэнтатыўным і з удзелам Старшыні Рады БНР.

10—13 сакавіка ў Страсбургу ў рамках сэсіі Эўрапарлямэнту прайшлі мерапрыемствы ў гонар 90-годзьдзя абвяшчэньня незалежнасьці Беларускай Народнай Рэспублікі пад назовам «Беларускі тыдзень». У Страсбургу Беларусь прадстаўляў увесь палітычны спэктар: ад Сяргея Калякіна да Паўла Севярынца.



Івонка Сурвілла ў Страсбургу была нарасхват.

Упершыню на ўзроўні Эўрапарлямэнту ўдалося арганізаваць такія дні. Прычым, з ініцыятывы беларускага боку. Старшыня Партыі БНФ Лявон Баршчэўскі, які браў удзел у «Беларускім тыдні», кажа: «Гэты пункт у рамках сьвяткаваньня 90-годзьдзя БНР быў зацьверджаны яшчэ ўвосень. У сувязі з тым, што зьмянялася кіраўніцтва групы па справе Беларусі ў Эўрапарлямэнце, то рэальна гэтымі справамі ўдалося заняцца толькі на пачатку студзеня, тым ня менш удалося вырашыць усе арганізацыйныя і тэхнічныя пытаньні за такі кароткі час. Значную арганізацыйную частку ўзяў на сябе Міжнародны рэспубліканскі інстытут. Чаму такіх сустрэч не было дзесяць гадоў таму? Таму што не было у Эўрасаюзе краін, якія ўступілі ў арганізацыю ў 2004 годзе. Безумоўна, роля польскіх, літоўскіх, латвійскіх эўрадэпутатаў асабліва яркая. Яны найбольш актыўна ўдзельнічалі ва ўсіх круглых сталах. Яны падзяляюць наш непакой».



Зьміцер Вайцюшкевіч і ягоная капэля.

Адбыліся і некаторыя накладкі. Не было магчымасьці купіць авіябілет для паэта Генадзя Бураўкіна, а аўтобусам ён ехаць ня змог. «У астатнім лічу, што ўсё прайшло пасьпяхова. Пацешыў узровень сустрэч. На афіцыйным адкрыцьці тыдня выступіў прэзыдэнт Эўрапарлямэнту Ганс-Герт Пётэрынг і эўракамісар у справах міжнародных дачыненьняў і пашырэньня ЭС Бэніта Фэрэра-Вальднэр. Гэта сьведчыць пра самы

высокі ўзровень тыдня. Тое, што афіцыйнае запрашэньне атрымала старшыня Рады БНР Івонка Сурвілла, таксама беспрэцэдэнтна. Яе прэзэнтавалі, як кіраўніка беларускага ўраду за мяжой і гэта было вельмі важна. Гаварылі пра пераемнасьць традыцый, што беларуская незалежнасьць была адноўленая 90 гадоў назад. Напэўна, на ўзроўні Страсбургу на афіцыйным узроўні такія заявы гучалі ўпершыню», — адзначыў Лявон Баршчэўскі.

Удалося правесьці сустрэчы з кіраўніком найбуйнейшай фракцыі Эўрапейскай народнай партыі. Ён меў сустрэчу з усёй дэлегацыяй, а таксама асабіста зь Лявонам Баршчэўскім і намесьнікам старшыні АГП Яраславам Раманчуком. Гаварылася пра канкрэтныя магчымасьці супрацы, пра лабіраваньне інтарэсаў Беларусі на міжнароднай арэне. Прычым, ня толькі партыйных інтарэсаў, але і, скажам, зьніжэньне цэнаў візаў для беларусаў. Л.Баршчэўскі на экзэмплярах эўраслоўнікаў, якія падарыў Пётэ-



**«Вось такія шанцы на выбарах». Намесьнік старшыні Партыі БНФ А.Янукевіч нешта тлумачыць П.Севярынцу.**

рынгу і Фэрэры-Вальднэр, замацаваў налепку з фразай: «Зьнізьце цэны візаў для беларусаў».

З словаў Л.Баршчэўскага, прыярытэтным пытаньнем была праблема палітвязьняў. «Мяне ўстрывожыла, што калі я ў сваім выступе назваў прозьвішча ня толькі Аляксандра Казуліна, але і Андрэя Кіма зь Сяргеем Парсюкевічам, казаў, што ёсьць і ўскосна рэпрэсаваныя, якіх выключылі з ВНУ ці звольнілі з працы, то эўрапейцы схільныя называць палітвязьнем толькі Казуліна», — кажа старшыня Партыі БНФ.

Асаблівая ўвага была нададзеная супрацоўніцтву эўрапейскіх унівэрсытэтаў з тымі ВНУ Беларусі, якія заплямілі сябе рэпрэсіямі супраць студэнтаў. Наконт гэтага асабліва распытвала група швэдзкіх дэпутатаў.

Сябры дэлегацыі папрасілі эўрадэпутатаў адсочваць сытуацыю 25 Сакавіка, калі ў Менску адбудзецца традыцыйнае шэсьце з кветкамі і песьнямі. І.Сурвілла перад адʼездам у Страсбург накіравала ад свайго імя лісты кіраўнікам найбуйнейшых дзяржаваў з просьбай таксама сачыць за падзеямі Дня Волі. Ёсьць надзея, што некаторыя дэпутаты 25 Сакавіка прыедуць у Менск, але пытаньне ўпіраецца ў візы.

Старшыня Беларускай асацыяцыі журналістаў Жанна Літвіна дамовілася пра слуханьні ў Эўрапарлямэнце з нагоды функцыянаваньня незалежных СМІ ў Беларусі.

«Акацыя 90-годзьдзя БНР досыць унікальная. Але я думаю, што ўвага да Беларусі з боку Эўропы прападзе толькі калі тут усталюецца дэмакратыя», — падсумоўвае Л.Баршчэўскі.

**Зьміцер Панкавец**



**Аляксандар Мілінкевіч і ягоны памочнік Алесь Лагвінец.**

# «Дарога» Івонкі Сурвіллы

Выйшла кніга ўспамінаў старшыні Рады БНР. Шлях на эміграцыю для сям'і Шыманцоў — а яна нарадзілася ў сям'і Ўладзімера і Эвеліны Шыманцоў — быў адрозны ад шляху іншых выгнанцаў 1944 г.

Шыманцы не жылі ў паваеннай Нямеччыне, яны тры гады прабылі ў Даніі, дзе У.Шыманец заснаваў беларускае згуртаваньне, у 1948 г. выехалі ў Францыю. У 1959 г. Івонка Шыманец узяла шлюб зь Янкам Сурвіллам і пераехала да мужа ў Мадрыд. Тут яна цягам шасьці з паловай гадоў дапамагала яму рабіць штодзённыя беларускія перадачы на Нацыянальным радыё.

У 1969 г. Сурвіллы пераехалі ў Канаду, дзе пачаўся новы этап жыцьця, які ўключыў у сябе і працу ў Этнакультурнай радзе, і старшынства ў Радзе БНР, а ад канца 1980-х — дапамогу дзеткам — ахвярам Чарнобыльскай трагедыі.

Гэтая кніга — ці не адзіныя мэмуары кіраўніка БНР. Безумоўна, ёсьць успаміны Язэпа Сажыча, але яны ў некалькі разоў меншыя па аб'ёме і ня выцягнулі на асобную кнігу. Ні Мікола Абрамчык, ні Вінцэнт Жук-Грышкевіч успамінаў не пакінулі. Кніга добра ілюстраваная.

Прэзэнтацыя кнігі прайшла ў Менску на Ўправе БНФ 17 сакавіка. На жаль, у ёй ня брала ўдзелу аўтарка: яна вельмі хацела б быць разам з удзельнікамі, але пасол Беларусі ў ЗША Міхаіл Хвастоў прапанаваў напісаць ліст Аляксандру Лукашэнку, каб яе ўпусьцілі ў краіну. Спадарыня Сурвілла сказала, што, па-першае, не гатовая напісаць такі ліст, а па-другое, яна лічыць ненармальным ехаць у Беларусь, калі яна змагаецца супраць цяперашняга рэжыму.



**Івонка Сурвілла. Дарога. Стоўпцы — Капэнгаген — Парыж — Мадрыд — Атава — Менск** (Бібліятэка Свабоды. XXI ст.). Радыё «Свабодная Эўропа» / Радыё «Свабода», 2008. — 144 с.

**АГ**

# Юбілейныя паштоўкі

З нагоды 90-х угодкаў абвяшчэньня Беларускай Народнай Рэспублікі выйшлі некалькі сэрыяў юбілейных калекцыйных паштовак. У Горадні мясцовыя энтузіясты выпусьцілі сэрыю з 13 паштовак пад назвай «Горадня — другая сталіца БНР». Дзеля гэтага былі выкарыстаныя знойдзеныя ў архівах старыя здымкі, самы стары зь якіх датаваны 1909 годам.

У Менску выйшла сэрыя з трох паштовак. На кожнай выяўленая нацыянальная сымболіка — герб «Пагоня» і бел-чырвона-белы сьцяг, гімн «Мы выйдзем шчыльнымі радамі». На адной з паштовак — фрагмэнт літаграфіі В.Сташчанюка з выявай будынку па вуліцы Валадарскага, 9, дзе была абвешчаная БНР. Дзьве іншыя — з выявамі старога Менску і Вільні. Аўтары дызайну й мастацкага аздабленьня — Аляксей Марачкін, Ігар Марачкін і Мікола Купава. Паштоўкі можна знайсьці на сядзібе БНФ.




У Берасьці ж выйшла паштоўка з выяваю Станіслава Булак-Балаховіча. Як вядома, жаўнеры-балахоўцы спачываюць на Гарнізонных могілках гораду над Бугам.

**СП**

### Паэтычны конкурс да 25 Сакавіка

Вас яшчэ ня ведаюць як выбітнага творцу? Вашых вершаў яшчэ не сьпявалі, не друкавалі і не дэклямавалі па радыё! Час выпраўляць такую сытуацыю! Дашліце пяць вершаў на конкурс, прысьвечаны 90-й гадавіне БНР, «Заклік на Волю» на bnr90viersy@gmail. com да 1 сакавіка і атрымайце прыз за 1-е, 2-е ці 3-е месца!

Дасылайце вершы на тэму свабоды і незалежнасьці (свабода і яе сымбалі, шляхі яе здабыцьця, незалежнасьць Беларусі, барацьба за незалежнасьць у мінулым стагодзьдзі і цяпер, Беларуская Народная Рэспубліка і яе выбітныя грамадзяне, ідэі БНР і г.д.). Пераможцаў будуць вызначаць да 25 Сакавіка філёзаф Валянцін Акудовіч, пісьменьнік Уладзімер Арлоў, культуроляг Максім Жбанкоў, паэты Андрэй Хадановіч, Джэці, Віка Трэнас, Юлія Шастак, псыхоляг Эльза Волат, а таксама пан Скіргайла Палянэцкі-Мацкевіч.

# Кніга Петрашкевіча і каляндар ад «Бацькаўшчыны»

Напярэдадні 25 Сакавіка «Згуртаваньне беларусаў сьвету «Бацькаўшчына» і Рада БНР зрабілі падарунак аматарам гісторыі — два друкаваныя выданьні, зьвязаныя з гісторыяй Беларускай Народнай Рэспублікі.

Першае — новая п'еса драматурга, пісьменьніка, публіцыста, заслужанага работніка культуры Беларусі, кандыдата гістарычных навук Алеся Петрашкевіча «Приласкать и уничтожить». У гэтым творы аўтар закранае гісторыю станаўленьня нашай дзяржаўнасьці і распавядае пра тое, як ствараласяБеларуская Народная Рэспубліка.

Таксама выйшаў насьценны перакідны каляндар да 90-годзьдзя БНР: «1918—2008». Ён зьмяшчае дванаццаць фатаздымкаў старшыняў Рады і Ўраду БНР. Прадмову да календара напісалі першы намесьнік старшыні Рады БНР Сяргей Навумчык і радны БНР, гісторык Янка Запруднік.

Каляндар можна пабачыць на Ўправе БНФ, сядзібе ТБМ, Акадэмкнізе, на knihi.net.

**СП**

# Агульнанацыянальная дыктоўка

прысьвечаная 90-годзьдзю Беларускай Народнай Рэспублікі.

## Менск

Тэкст першай беларускай агульнанацыянальнай дыктоўкі, якая будзе працягвацца да 20 хвілін, будзе складацца з фрагмэнтаў 2-й і 3-й Устаўных Грамат, у якіх гаворка ідзе аб правах і свабодах грамадзян Беларусі, а таксама з аднаго артыкула Ўсеагульнай дэклярацыі правоў чалавека.

Агульнанацыянальная дыктоўка на сядзібе ТБМ будзе адбывацца паводле наступнага графіку:

11:00 — Савецкі і Першамайскі раёны,

12:00 — Ленінскі, Цэнтральны і Кастрычніцкі раёны,

13:00 — Маскоўскі і Фрунзэнскі раёны,

14:00 — Заводзкі і Партызанскі раёны,

15:00 — Менскі раён і тыя, хто не пасьпеў напісаць дыктоўку разам з калегамі са сваіх раёнаў,

16:00 — тыя, хто не пасьпеў напісаць дыктоўку разам з калегамі са сваіх раёнаў.

Сябры палітычных партый запрашаюцца пісаць агульнанацыянальную дыктоўку на офісе БНФ (праспэкт Машэрава, 8). Дыктоўка будзе пачынацца аб 11, 12, 13, 14, 15, 16-й гадзінах.

## Горадня

Агульнанацыянальная дыктоўка да 90-х угодкаў БНР праходзіць у памяшканьні Таварыства беларускай школы з 12 да 16 гадзінаў. У якасьці тэксту вырашана ўзяць прадмову да зборніка Францішка Багушэвіча «Дудка беларуская». Праводзіць дыктоўку будуць супольна гарадзкія арганізацыі ТБШ і ТБМ. Усе, хто захоча пісаць яе, атрымаюць асадкі з надпісам: «Удзельніку агульнабеларускай дыктоўкі. Горадня, 22.03.2008».

Створаны прызавы фонд: самы малады і самы стары з удзельнікаў атрымаюць падарункі.

## Віцебск

17 сакавіка на офісе Партыі БНФ у Віцебску ў межах агульнанацыянальнай акцыі адбылася дыктоўка па беларускай мове, прымеркаваная да 90-годзьдзя абвяшчэньня БНР. Узялі ўдзел сябры партыі.

Пададзеная заяўка ў абласную бібліятэку на правядзеньне дыктоўкі ў беларускай залі 23 сакавіка з 14.00 па 14.30 ад імя абласной арганізацыі ПБНФ за подпісам старшыні рады К.Смолікава.

## Магілёў

Дыктоўка мае адбыцца 23 сакавіка. Даведкі праз тэл. 388-35-61.

## Дыктоўка на радыё

Усе тыя, што жадаюць далучыцца да напісаньня агульнабеларускай дыктоўкі з нагоды 90-х угодкаў БНР, але ня ведаюць дзе, могуць зрабіць гэта не выходзячы з дому. У суботу, 22 сакавіка, і ў нядзелю, 23 сакавіка, з 12-й да 13-й і з 16-й да 17-й гадзіны ў этэры Эўрарадыё прагучыць дыктоўка, якую будуць пісаць беларусы па ўсім сьвеце. Слухаць Эўрарадыё ў гэты час можна ў інтэрнэце на www.euroradio.fm, а таксама на спадарожніках Hotbird 6 (13° East (11013МГц/H/27500)) і Sirius 4 (5°East (12379.62МГц/H/27500)).

З 20 да 30 сакавіка на сайце Эўрарадыё можна будзе спраўдзіць, як ты напісаў дыктоўку праз адмысловую форму.

**СП**

# Дыпляматы замежных краінаў падтрымалі беларускую мову

15 сакавіка на сядзібе ТБМ у Менску стартавала агульнананацыянальная дыктоўка. Удзел бралі паслы, дзеячы культуры, прадстаўнікі СМІ.

Дыктоўка, прымеркаваная да 90-годзьдзя БНР, задумлялася найперш як акцыя салідарнасьці, пісаць яе ўсенародна прапануецца 23 сакавіка. «Сёньняшняя сустрэча на ТБМ была выкліканая тым, што ня ўсе дыпляматы, якія захацелі выказаць падтрымку беларускай мове, змогуць узяць удзел у дыктоўцы 23-га», — кажа ініцыятар ідэі Ўладзімер Падгол.



WWW.NAVINY.BY

На сядзібу ТБМ прыйшлі дыпляматы зь Вялікай Брытаніі, ЗША, Літвы, Польшчы, Славакіі, Украіны, Чэхіі і Швэцыі. Перад уласна пісаньнем адбыўся імправізаваны паэтычны фэстываль, зладжаны сіламі дыпляматычнага корпусу. Часовы паверааны ў справах Славаччыны ў Беларусі Любамір Рэгак прачытаў верш клясыка славацкае літаратуры Паўла Орсага Гвездаслава, прысьвечаны роднай мове. Пераклад рабіў сам спадар Рэгак з дапамогаю Васіля Сёмухі. Сьледам гучалі па-беларуску творы зь літоўскае, польскае, украінскае клясыкі, якія чыталі прадстаўнікі гэтых краінаў — дарадца пасла Літвы Дарьюс Віткаўткас, прэс-сакратар пасольства Польшчы Моніка Садкоўска, пасол Украіны Ігар Ліхавы. Часовы паверааны ў справах Вялікабрытаніі Найджэл Гулд-Дэвіс прачытаў па-ангельску **(на фота)** адзін з санэтаў Янкі Купалы. Гэтыя выступы-прысьвячэньні, паводле словаў ініцыятараў, мусіла распачаць чытаньнем па-беларуску «Білю аб правах чалавека» пасол ЗША Карэн Ст'юарт.

У якасьці тэксту дыктоўкі была абраная адаптаваная прадмова да «Дудкі беларускай» Францішка Багушэвіча. Замежнікі, хто не пачуваўся пэўным у мове, пісалі па-свойму, праз перакладчыкаў.

Прадстаўнік Швэцыі Стэфан Эрыксан пісаў дыктоўку па-беларуску і сярод першых здаў яе на праверку. Іншы выдатны знаўца беларускай мовы, пасол Ізраілю Зэеў Бэн-Ар'е, ня змог прысутнічаць з прычыны шабату. Але ён паабяцаў узяць удзел у агульнанацыянальнай дыктоўцы 23 сакавіка.

«Галоўная ж тут ня колькасьць памылак, галоўнае — удзел, — кажа У. Падгол. — Галоўнае — паказаць, што мова наша для нас сьвятая».

**Прысутны**

# «На рамантычным падмурку нельга пабудаваць нацыянальную ідэю»

Гісторыкі Беларусі пра БНР з пазыцыі дня сёньняшняга.

Напярэдадні 90-годзьдзя абвяшчэньня БНР Рэдакцыя зьвярнулася да беларускіх гісторыкаў з просьбай адказаць на два пытаньні: як зьмянялася Вашае ўяўленьне пра БНР ад 1990-х гадоў да сёньняшняга часу? якія новыя факты, датычныя БНР, Вам удалося выявіць за гэты час?

### Анатоль Грыцкевіч, Менск

З 1990-х гадоў пачынаючы я прапагандаваў БНР як узор для сучаснага дзяржавабудаўніцтва, я працягваю рабіць гэта і цяпер. Нам трэба вывучаць досьвед таго часу. Бо хоць афіцыйна БНР і не была прызнаная Нямеччынай — гэтага не дазвалялі ўмовы Берасьцейскага міру, паводле якога нельга было прызнаваць ніякіх дзяржавастварэньняў на гэтай тэрыторыі, — але фактычна нямецкія генэралы былі вымушаныя лічыцца са структурамі БНР. БНР змагла ўсталяваць дыпляматычныя адносіны з шэрагам краін, мела генэральнага консула ў Маскве, хаця ўрад РСФСР яе таксама не прызнаваў. Чаго не здалелі зрабіць? Войска, бо не дазвалялі немцы. Таму, калі бальшавікі пачалі наступаць, войска не было.

Я дэталізаваў абставіны перамоваў Антона Луцкевіча з урадам Леніна ў пачатку лістапада 1918 г., калі Нямеччына цярпела паразу. Луцкевіч прапаноўваў, каб РСФСР прызнала БНР і нават пагаджаўся на саветызацыю, толькі пры поўнай незалежнасьці, але гэтага не адбылося.

### Натальля Гардзіенка, Менск

Калі я ўпершыню даведалася пра БНР, яна асацыявалася ў мяне толькі з падзеямі 1918 году ў Беларусі. А затым я пачала знаходзіць больш інфармацыі пра тое, што адбывалася з БНР пасьля за межамі Беларусі. Было цікава адкрыць, што Рада БНР актыўна дзейнічала ў другой палове стагодзьдзя, мела прадстаўніцтвы ў ЗША, Вялікай Брытаніі, Францыі, Аўстраліі.

Цяпер мы лепей бачым, што людзі, якія рабілі БНР, былі звычайнымі людзьмі, і яны таксама памыляліся, часам моцна.

Дасьледуючы гісторыю эміграцыі, можна сьцьвярджаць, што ідэя БНР як незалежнай беларускай дзяржавы стала асновай для гуртаваньня беларускай дыяспары на Захадзе ў паваенны час.

### Андрэй Вашкевіч, Горадня

Упершыню пра БНР я даведаўся ў юнацтве, чытаючы кнігі Ліса, Арлова. Прафэсійна займацца гісторыяй я пачаў ад 1999 году. Уяўленьне пра БНР зьмянілася ад рамантычнага да больш рэалістычнага, нават крытычнага. Людзі, якія рабілі БНР, былі звычайнымі людзьмі, і яны таксама памыляліся, часам моцна. Важна ўяўляць, што на рамантычным падмурку нельга пабудаваць нацыянальную ідэю. Нават цяпер працягваюць зьяўляцца матэрыялы, якія міталягізуюць гісторыю. Хтосьці скажа, што гэта добра, але такія міты лёгка разьбіць.

Мне і маім калегам Алесю Пашкевічу, Андрэю Чарнякевічу ўдалося расшукаць новыя факты. Была напісаная біяграфія Сымона Якавюка, чалавека, які супрацоўнічаў з НКВД і фактычна спрычыніўся да таго, што ўрад БНР у 1925 годзе здаў мандат ураду БССР. Былі высьветленыя абставіны таго, як гэта адбылося. Многа новых фактаў у падрыхтаванай намі публікацыі «Кароткі нарыс беларускага пытаньня», якая была зьмешчаная ў ARCHE № 2, 2008.

### Андрэй Чарнякевіч, Горадня

Чакаюць свайго часу публікацыі, у якіх выкарыстаныя дакумэнты дэлегацыі місіі БНР на мірнай канфэрэнцыі ў Парыжы, лісты Луцкевіча з Парыжу, а таксама дакумэнты, датычныя дзейнасьці ўраду БНР у Горадні, апошняга на тэрыторыі Беларусі паседжаньня ў 1919 годзе.

### Анатоль Сідарэвіч, Менск

Нічога ў канцэпцыі не памянялася. Новыя дакумэнты, як, напрыклад, апублікаваныя ў кнізе «1 января 1919 года. Временное рабоче-крестьянское советское правительство Беларуси», толькі падмацоўваюць яе. У гэтай кнізе вуснамі Ісака Рэйнгальда гаворыцца, што калі б не было БНР, то не было б і БССР. Я ўпэўнены, што славуты пратакол паседжаньня ЦК расейскай камуністычнай партыі бальшавікоў, на якім вырашалася пытаньне пра ўтварэньне БССР зьнік з партыйнага архіву з волі Язэпа Сталіна, бо запісы ў ім не адпавядалі сталінскай вэрсіі падзей. Калі б не было 25 Сакавіка, не было б і абвяшчэньня БССР, не было б і сучаснай дзяржавы.

Я больш займаюся праблемай БНР праз асобу Луцкевіча. Сэнсацыйных дакумэнтаў ня выявіў, займаюся дэталізацыяй. Рыхтую артыкул, дзе паказваю па датах склад першага Народнага сакратарыяту БНР, спрабую паказаць, чаму немцам не ўдалося прызнаць БНР. Наступны артыкул будзе прысьвечаны статусу Найвышэйшай Рады БНР. Магчыма, гэтыя работы аформяцца ў кніжкі.

Зь іншага боку, даводзіцца расставацца з выдумкамі, легендамі нашай эміграцыйнай гістарыяграфіі і савецкай таксама. Я прыхільнік пазытывізму: кожны тэзіс павінен мець спасылку на дакумэнт.

### Віталь Скалабан, Менск

Больш яскрава зразумеў месца гэтай выдатнай падзеі у гісторыі нашай дзяржаўнасьці.

Тое, што мне і ўдалося выявіць, адлюстравана ў кнізе «1 января 1919 года. Временное рабоче-крестьянское советское правительство Беларуси. Сборник документов», якая выйшла ў суаўтарстве зь іншымі гісторыкамі ў 2005 годзе. Цяпер працую над рукапісам успамінаў удзельніка падзей 1917—1918 году Яўсея Канчара, якія ён скончыў у 1937 годзе ў Ленінградзе. Там шмат новага матэрыялу.

### Вадзім Гігін, Менск

Я заўсёды ведаў, што гэтае ўтварэньне ніколі не было паўнавартаснай дзяржавай. Гэта было палітычнае ўтварэньне зь вельмі слабымі лідэрамі, якія не маглі ўзяць на сябе адказнасьць за Беларусь. Трагедыя беларускага нацыянальнага руху заключалася ў тым, што яго ачолілі ня тыя людзі і ня ў той час. Больш за тое, тэзіс пра тое, што без БНР не было б БССР, зьняпраўджваецца ўсімі гістарычнымі дакумэнтамі. Яшчэ восеньню 1917 г. Ленін і Сталін прыйшлі да думкі пра неабходнасьць аўтаномнай беларускай дзяржавы. Былі распрацаваныя праекты. І БНР, сказіўшы волю Ўсебеларускага зьезду ў сьнежні 1917 году, дала козыры некаторым бальшавікам (Мясьнікову і Кнорыну) у барацьбе супраць стварэньня беларускай дзяржавы. Такім чынам, БНР затармазіла працэс стварэньня беларускай сувэрэннай рэспублікі — БССР.

Некаторыя дакумэнты, якія раней не былі выкарыстаныя дасьледчыкамі, мы публікуем у № 3 «Беларускай думкі». Яны паказваюць несамавітасьць, няслушнасьць лідэраў БНР, іхную карумпаванасьць, і тое, што яны выкарыстоўвалі ідэю БНР у асабістых мэтах.

На мяне вялікае ўражаньне аказалі запіскі Яўсея Канчара, якія ясна паказваюць, што ідэя фармаваньня беларускай савецкай рэспублікі была сфармуляваная восеньню 1917 г. І, канечне, «Нарысы расейскай смуты» Дзянікіна, дзе ён характарызуе прадстаўнікоў Менскай рады як нічога ня вартых самазванцаў.

### Алесь Пашкевіч (гісторык), Менск

Людзі майго пакаленьня, якія вучылі ў школе гісторыю па савецкіх падручніках, пра БНР практычна нічога ня ведалі. У 1990-х гадах пайшоў вал інфармацыі. Да пэўнага моманту стаўленьне да тых падзей было даволі ідэалізаванае. Падавалася, што гэта была дзяржава, якая адбылася, якая рэальна існавала як фактар міжнароднай палітыкі, якую потым зьмялі з мапы толькі збройнай сілай. Цяпер я лічу крыху іначай. Лічу, што наўрад ці трэба ставіць яе нароўні з тымі дзяржавамі, якія ўтварыліся тады. Аднак, безумоўна, я стаўлюся да БНР вельмі станоўча, бо безь яе не было б беларускай дзяржаўнасьці і невядома, ці захаваўся б беларускі народ.

**Запісвала НБ**




**Хрыстос на Плошчы Свабоды. З гэткай інсцэніроўкай менскія каталікі ў нядзелю сьвяткавалі Вербніцу.**

# Гэта салодкае слова

*І як моцна захочаш, то збудзецца ўсё:*
*Бунт, каханьне, царства, жыцьцё...*
***У.Караткевіч***

Ганна Журавіна. Эсэ.

Калісьці і я была маленькай паслухмянай дзяўчынкай. З тых, каго ў школе на бацькоўскім сходзе ставяць у прыклад іншым вучням, настаўнікі гладзяць па галоўцы, а аднаклясьнікі проста любяць. Проста за тое, што заўсёды ў час можна сьпісаць якасна зробленае хатняе заданьне. Па матэматыцы, напрыклад.

Я любіла разумныя кнігі пра «добрае і вечнае», марыла пра мір ва ўсім сьвеце, заўсёды яснае сонейка, блакітнае неба, пра такую ж сьветлую, як мае мары, будучыню, і… пра каханьне, канечне. Гадоў так да дванаццаці.

А вось потым… Потым я пачала марыць пра іншае. Пра свабоду. Прычым гэтае жаданьне свабоды зьявілася не адразу, а прыйшло паступова, паціху, незаўважна захопліваючы мае думкі. Спачатку яно праяўлялася толькі ва ўпартасьці слухаць менавіта тую музыку, якая мне падабаецца. Чытаць менавіта тыя кнігі, якія мне цікавыя. Займацца тымі справамі, якія сапраўды мяне захапляюць. Мець зносіны з тымі людзьмі, зь якімі мне добра, прычым калі захачу і дзе захачу. Такі вось падлеткавы крызіс. Аднак чамусьці ён, крызіс, зь цягам часу так і не прайшоў. Гады ішлі, а мая прага свабоды не зьменшалася. І я не спынялася. Мне хацелася як мага больш. Як мага больш свабоды. Яшчэ больш свабоды. Мне ўжо была патрэбная свабода выбару. Свабода ад пільнага бацькоўскага вока. Свабода ад суседзяў. Свабода ад думак і меркаваньняў іншых людзей. Свабода асабістых думак і выказваньняў. Свабода ад плётак і плеткароў. Свабода творчасьці. Свабода самавызначэньня...

Дзяўчынка-падлетак была яшчэ вельмі далёкая ад веданьня сваіх палітычных і грамадзянскіх правоў, аднак ужо тады ў яе галаву, забітую ружовымі марамі і вобразамі прыгожых знакамітых актораў і музыкаў, пачалі закрадацца ідэі пра свабоду слова, друку, думак. Пра свабоду палітычных поглядаў.

А потым я вырасла і паступіла ва ўнівэрсытэт. Таксама, дарэчы, колішняя мара. Гарант свабоды. Доказ. Сабе, бацькам, сябрам, нават ворагам, што я ўсё ж такі разумная і здатная дзяўчынка. І ўсё было б добра, і жыцьцё віравала і бурліла, зацягвала мяне глыбока і далёка, і навокал разгортваліся шмат якія цікавыя падзеі, зьявіліся новыя сябры і знаёмыя, новыя заняткі, новыя ўражаньні… Але аднаго не ставала — свабоды. У асяродку роўных сабе, маладых, зацікаўленых, моцных, таленавітых, актыўных, крэатыўных, прыгожых людзей, я яе не знайшла. Яе проста не было сярод нас. Не, яна існавала тэарэтычна. Яна была наборам гукаў, якія выляталі да нас з экранаў тэлевізараў, з круглых дыскаў радыё, з вуснаў выкладчыкаў і дзяржаўных прамоўцаў; яна была наборам літар у газэтах і кнігах, у падручніках па гісторыі Беларусі… Але свабоды не існавала практычна. Яе не было ні на мерапрыемствах ва ўнівэрсытэце, ні ў цесным пакойчыку інтэрнату, ні нават на вуліцах Менску. Я шукала яе і не знаходзіла. І раптам…

Раптам я знайшла… Не, не свабоду. Не яе саму. Але я ўсё ж такі мела магчымасьць слухаць яе словы, яе песьні, яе казкі. Яны гучалі на канцэртах забароненых гуртоў, на імпрэзах забароненых пісьменьнікаў, на чытаньнях забароненых кніг, на сьвяткаваньнях забароненых сьвятаў. Я амаль хапала яе за хвост, слухаючы радыё «Свабода», купляючы «Нашу Ніву» ў пераходах. І тады, 18 сакавіка 2006, стоячы ў вялізнай лужыне ад расталага сьнегу на плошчы Бангалор і падпяваючы Вольскаму, я адчувала зьмены, я была шчасьлівая, мне здавалася, што мая свабода зусім побач…

Але заставалася адно але… І гэтае але псавала шмат. Яно не давала мне магчымасьці да канца адчуць свабоду, атрымаць ад яе задавальненьне. Гэта быў мой страх. Я баялася. Баялася быць свабоднай. І дзе б я ні была, мой страх быў заўсёды побач са мной. Захоўваў мяне ад свабоды. Ахоўваў. Я з захапленьнем зьядала вачыма людзей са значкамі «За свабоду», з блакітнымі стужкамі ў валасах. І сама насіла такую ж. У сумцы. Каб ніхто не здагадаўся. Бо баялася. Я крычала «Ганьба» на Плошчы разам з натоўпам у сакавіку 2006-га, але нават тады я баялася, што ўсё скончыцца хутка. Баялася амапаўцаў. Момантамі думала не пра волю, а пра іхныя дручкі. Я з задавальненьнем слухала яскравых прамоўцаў на мітынгах і чытала сьмелыя артыкулы ў газэтах. І сама пераказвала іх сваім знаёмым зь вялікім імпэтам, актыўна выказвала сваю грамадзкую пазыцыю. Зачыніўшыся на цеснай кухні, каб (крый Божа!) ніхто не пачуў. Каб ні адзін гук ня выйшаў праз шчыльна зачыненыя дзьверы. Я ўсяго баялася. Але ж як хацелася свабоды…

А потым было 25 Сакавіка 2007 году. І сьвяціла сонейка, і сьпявалі птушачкі, і вясна прачыналася ў нашых зацягнутых зімовым павуціньнем сэрцах. І калі я апынулася ў натоўпе аднадумцаў, сярод даволі вялікай колькасьці людзей, я раптам зразумела… што ня ведаю, навошта я тут. Што ў пошуку я згубіла сваю галоўную мэту. Што мяне больш ня радуе нічога. Я перастала чакаць прыходу свабоды. Я зачыніла перад ёй свае дзьверы. Забарыкадавалася. Страхам. Я забыла пра яе… Я сканцэнтравалася на сабе, на сваіх адчуваньнях і пачуцьцях.Ператварыла сваё ўласнае жыцьцё ў гульню. І выпала з рэчаіснасьці. Згубілася. Я шмат плакала ў той дзень. І ніхто ня мог суцешыць мяне, бо я сама была вінаватая ва ўсім. Але ў мяне яшчэ быў шанец. Шанец на вяртаньне.

Мінулы сакавік 2007-га шмат што зьмяніў у маім жыцьці. Ён стаў пачаткам майго ўласнага адраджэньня. Можа, і крыху марудным, але нараджэньнем новага чалавека. Той жа сэнтымэнтальнай і чульлівай, але… Разумнай і моцнай дзяўчынкі. Хаця і з ружовымі марамі. Свабоднай. Не, тады я яшчэ не схапіла свабоды, ня здолела. Я была ня вартая яе. І я разумела гэта. Спатрэбілася шмат дзён упартай барацьбы. З сыстэмай. Зь іншымі людзмі. З сабой, у першую



Юлія Дарашкевіч

чаргу. І часам страх зноў грукаў у маю шыбу, зрываў дах. Але я змагалася. Упарта. І цяпер я ведаю, што ўсё гэта было не дарма...

…І зноў сакавік. Жаданая і доўгачаканая вясна. І гэтую вясну я ўпершыню сустракаю не адна. Я сустракаю яе разам са сваёй свабодай. І гэта ўжо назаўсёды.

А жыццё мяняецца. Ня ў лепшы, часам, бок. Наша грамадзтва апынулася ў вялізнай пастцы, вялізным коле, плошча якога, аднак, з кожным годам усё больш звужаецца. А мы маўчым. Моўчкі чакаем, што зьявіцца нехта. І гэты Нехта парве, растопча мяжу, якая аддзяляе нас ад шчасьця. Скажа, як вырвацца з гэтага кола. І не разумеем, што ніхто нам не дапаможа, пакуль у нашых сэрцах жыве страх. Мы выбіраем не свабоду, а менавіта яго. Мы баімся жывых словаў, жывых думак, жывой музыкі заклікаў, мы баімся ня тое, што разам выйсьці на вуліцы, але нават глядзець у вочы адно аднаму. Пасьміхнуцца адно аднаму. Адчуць падрымку. Скажаце, ёсьць за што баяцца? За працу? Але ж нават стараннаму працаўніку цяпер цяжка зарабіць болей грошай. За ўнівэр? Але навошта ён, калі праз некалькі год навучаньня ў ім ён пачынае атаясамлівацца толькі ўласна з будынкам і няўтульнай аўдыторыяй, дзе, аднак, так утульна паспаць на пары. За родных і блізкіх? Дык ці ня дзеля іх нашыя змаганьні? Разам жа мы сіла. Усе. У натоўпу голас гучнейшы, чым у аднаго чалавека. Натоўп і ёсьць адным вялізным дужым чалавекам. Дык, можа, скажам уголас, чаго нам трэба. Разам. І тады ня будзе патрэбы баяцца. Хавацца. Падпарадкоўвацца супраць волі. Мы павінныя быць вольнымі. Свабоднымі. Мы маем права. І мы будзем.

**P.S.** Прыгожым лютаўскім вечарам вярталіся зь сяброўкай з канцэрту разбэшчанай маскоўскай гіпушкі. Рок-н-рольныя мэлёдыі скакалі ў нашых галовах. Ішлі і размаўлялі пра моладзь, асабліва хлопцаў, сьпявачку і ўзьдзеяньне яе музыкі на людзей. Было надзвычай лёгка і свабодна.

— Дзяўчаты, а ці ведаеце вы, як раней гэтая вуліца называлася? Не, яшчэ да праспэкту Машэрава? Ня ведаеце? А дарма…Тракт. А чаму цяпер гэта — праспэкт Пераможцаў? Пераможцаў каго над кім? Лукашэнкі над беларусамі? — перахапіў нашу ўвагу інтэлігентны дзядзечка.

Мы толькі пасьміхнуліся яму. А я падумала, што зраблю ўсё, каб насуперак любым перашкодам, праспэктам *Независимости*, зялёным колерам, ідэалёгіі, вусам, лысінам, камбайнам і трактарам, барацьбе за ўраджай кожны год, аграгарадкам і канцэртам «За Беларусь!» на вуліцах майго, нашага гораду зьявілася новая вуліца. Вуліца імя Перамогі. Перамогі над страхам. А потым шмат праспэктаў Пераможцаў. З нашымі з вамі імёнамі. Свабоднымі імёнамі свабодных людзей… Свабоднай краіны.

# Дзень Волі ў замежжы



## Вільня: Дзень беларускага адзінства

90-я ўгодкі Беларускай Народнай Рэспублікі сёлета ў Вільні будуць адзначацца не ў асобных суполках і арганізацыях, як раней, а як супольнае сьвята, як Дзень беларускага яднаньня. Такім чынам будзе аднаўленая даваенная традыцыя, калі ў дзень 25 сакавіка ў Вільні праходзілі супольная малітва за Беларусь, урачысты сход, канцэрт і шэсьце. У такі дзень забываліся палітычныя падзелы і асабістыя амбіцыі, а ўся беларуская грамада пачувалася адным цэлым. Гэтак мяркуецца зрабіць і сёлета.

А 12-й гадзіне адбудзецца ўскладаньне вянка да помніка стваральнікам БНР братам Івану і Антону Луцкевічам на могілках Роса. А 15-й гадзіне распачнецца Ўрачысты сход і сьвяточны канцэрт у віленскім Доме настаўніка. Пасьля канцэрту публіка рушыць шэсьцем да Базыльянскіх муроў, дзе а 17.30 у царкве Сьвятой Тройцы адбудзецца супольная малітва за Беларусь.

Арганізуюць Дзень беларускага яднаньня вядомыя віленскія дзеячы разам са студэнтамі гарадзкіх унівэрсытэтаў і проста неабыякавымі да незалежнасьці Беларусі людзьмі — бізнэсоўцамі, пэдагогамі, журналістамі. Дэвіз сёлетняга сьвята: «Будзьма разам у гэты дзень!»

## Канфэрэнцыя ў Празе

22 сакавіка ў Празе пад патранатам міністра замежных справаў Чэхіі адбудзецца сустрэча ў гонар 90-годзьдзя БНР. З дакладамі на ёй выступяць Івонка Сурвілла, Зянон Пазьняк і Сяргей Шупа. Сярод іншых удзельнікаў будуць таксама Ўладзімер Арлоў, Павал Севярынец і Ян Румл — былы дысыдэнт, пасьля міністар унутраных справаў Чэхіі, а цяпер — кіраўнік ініцыятывы «Грамадзянская Беларусь».

Ахвотныя паўдзельнічаць у сустрэчы могуць дасылаць лісты на скрынку info@civicbelarus.eu.

## Беларуская вясна ў Кіеве

З 22 сакавіка да 12 красавіка ў Кіеве будзе праходзіць фэстываль сучаснай беларускай культуры «Беларуская вясна». Фэстываль адбудзецца ў другі раз і сёлета будзе ўключаць вулічны пэрформанс, кінапаказы (у тым ліку прэм'ерныя), вечар беларускай флэш-анімацыі, выставу фатаздымкаў і СМІ Беларусі, круглы стол мэдыя-мэнэджараў, канцэрт этна-гуртоў і украінска-беларускую літаратурную вечарыну.

Знакам фэстывалю стала бел-чырвона-белая падводная лодка.

## Варшава: маніфэстацыя, фэстываль і канцэрт N.R.M.

25 сакавіка ў польскай сталіцы адбудзецца маніфэстацыя салідарнасьці зь Беларусьсю. Акцыя пачнецца ў Кракаўскім прадмесьці побач з помнікам Капернікy а 18-й.

А гурт N.R.M. зайграе жывы канцэрт у этэры музычнай студыі Польскага Радыё-3 (слухаць можна ў інтэрнэце па адрасе http://www.polskieradio.pl/sluchaj/play.aspx?p=r3). Замовы квіткоў па варшаўскім тэл. 22-333-333. Пачатак а 21.05 па беларускім часе.

30 сакавіка ў Варшаве адбудзецца канцэрт «Салідарныя зь Беларусьсю». У канцэрце возьмуць удзел як беларускія, так і польскія зоркі року і поп-музыкі, якія выканаюць вядомыя ў сваіх краінах гіты ў новых, дзьвюхмоўных, аранжыроўках.

Галоўная тэма сёлетняга канцэрту — падтрымка беларускае мовы, на якой засьпяваюць музыкі. Падчас канцэрту таксама будуць зьбірацца грошы на падтрымку зачыненага ўладамі Беларусі Ліцэю ім. Якуба Коласа ў Менску.

Канцэрт будзе трансьлявацца тэлеканалам «Белсат». Больш інфармацыі: www.solidarnizbialorusia.pl.

## Палітычная маніфэстацыя ў Нью-Ёрку

У суботу, 22 сакавіка, перад будынкам штаб-кватэры Аб'яднаных Нацыяў на Мангэтане ў Нью-Ёрку пройдзе мітынг, прысьвечаны 90-м угодкам абвяшчэньня Незалежнасьці Беларускай Народнай Рэспублікі (Акту 25 Сакавіка 1918 году).

Мітынг ладзіцца нью-ёрскім аддзелам БАЗА. Пачатак мітынгу — а 11-й раніцы, на Першай Авэню пры 43-й вуліцы.

Пасьля мітынг плянуецца прадоўжыць перад Місіяй РБ пры ААН.

## Сьвяточныя банкет і канцэрт у Hyatt Regency ў Нью-Брансуіку

Беларуска-амэрыканскае задзіночаньне запрашае на Ўрачыстую акадэмію, банкет і канцэрт, прысьвечаныя 90-м угодкам абвяшчэньня незалежнасьці Беларускай Народнай Рэспублікі. Імпрэза адбудзецца ў нядзелю, 30 сакавіка 2008 г. а 12.30 у Regency Ballroom гатэлю Hyatt Regency па адрасе: 2 Albany Street, New Brunswick, New Jersey 08901.

Перад імпрэзай а 10 раніцы адбудзецца Сьвятое Набажэнства ў Царкве Сьв. Маці Божае Жыровіцкае Беларускай Аўтакефальнай Праваслаўнай Царквы, па адрасе: 9 River Road, Highland Park, New Jersey.

Квіткі па замове: $50 —дарослым, $40 — студэнтам.

Квіткі пры дзьвярах: $60 —дарослым, $50 — студэнтам.

Просім замовіць квіткі загадзя, да 25 сакавіка 2008, даслаўшы аплату на адрас:

Ms. Luda Bakunovich
37 Sand Hill Road
Kendall Park, NJ 08824

Чэкі выпісваць на: Belarusan American Association

Інфармацыя:
Сп. Юрка Азарка 732-560-8610
Сп. Віталь Зайка 718-296-1458.

## Таронта і Атава запрашаюць

Беларусы Канады запрашаюць на сьвяточныя мерапрыемствы, прысьвечаныя 90-годзьдзю БНР у канадзкіх гарадах — Таронта і Атава. Таронтаўцы запрашаюць адсьвяткаваць угодкі БНР а 19 гадзіне 22 сакавіка ў залі Беларускага грамадзка-рэлігійнага цэнтру (524 St. Clarens Avenue). У праграме вечарыны плянуецца Ўрачысты малебен, даклад і сьвяточны канцэрт. Беларусы Атавы плянуюць правесьці ўрачыстасьць 5 красавіка а 14 гадзіне ў City Hall, 110 Laurier Avenue West. У праграме — сьвяточныя віншаваньні, канцэрт і вячэра.

## Лёндан

Урачысты банкет з нагоды Дня Волі адбудзецца 28 сакавіка, у пятніцу ад 18.00 да 20.00, у адным з гатэляў у цэнтры Лёндану. Даведкі пра месца і ўмовы праз тэл. +020 76 09 13 19 (Сяргей Пяткевіч або Лёля Міхалюк).

**Падрыхтаваў Сямён Печанко**

# Беларусь наняла піяршчыка Беразоўскага

Акрамя апальнага расейскага алігарха, кліентамі Тыматы Бэла былі Маргарэт Тэтчэр, а таксама манархія Саудаўскай Арабіі.



БЕЛТА

Аляксандар Лукашэнка прапанаваў гуру брытанскай PR-індустрыі Тыматы Бэлу папрацаваць над паляпшэньнем іміджу Беларусі на Захадзе.

На сустрэчы зь піярнікам А.Лукашэнка заявіў, што ніводная сучасная дзяржава ня можа абысьціся без прафэсійных PR-паслуг. «Вам будзе прыемна працаваць у нашай краіне, зь людзьмі, той уладай, якая існуе ў Беларусі, — сказаў кіраўнік дзяржавы. — Перш, чым Вы будзеце ўпэўненым прыхільнікам нашай краіны, Вы пераканаецеся, што Беларусь — эўрапейская дзяржава і наш народ у гісторыі зрабіў вельмі многа для Эўропы», — сказаў А.Лукашэнка (цытата БЕЛТА).

Т.Бэл заслужыў сабе вядомасьць як дарадца па пытаньнях PR былое прэм'ер-міністаркі Вялікай Брытаніі Маргарэт Тэтчэр. Грунтуючыся на гэтым досьведзе, ён стаў працаваць зь «цяжкімі кліентамі». Сярод іх былі апальны расейскі алігарх Барыс Беразоўскі, экс-прэм'ер Тайлянду Таксын Чынаўат, адхілены ад улады па абвінавачваньнях у карупцыі, а таксама манархі Саудаўскай Арабіі. Апошнім часам ён дапамагаў таксама прэзыдэнту Францыі Нікаля Саркозі: прэса кпіла з апошняга празь ягоны маленькі рост.

Піяр-агенцтва Бэла «Чайм Камюнікейшн» працуе і з звычайным бізнэсам: да прыкладу, займаецца маркетынгам Алімпійскіх гульняў у Лёндане.

Пра дзейнасьць «Чайм Камюнікейшн» і яе фінансавыя вынікі можна прачытаць на сайце агенцтва. Даход «Чайм Камюнікейшн» у 2006 г. склаў 78,8 млн брытанскіх фунтаў (каля $165 млн), прыбытак — 12,3 млн фунтаў.

«Мы разьлічваем, што Вы будзеце паслом добрай волі ад самой Вялікабрытаніі, зь якой у нас вельмі актыўна разьвіваюцца адносіны, нягледзячы на нелады ў палітычнай сфэры», — сказаў Т.Бэлу А.Лукашэнка на сустрэчы, перадае агенцтва БЕЛТА.

«Сёньня сьвет разьвіваецца такім чынам, што без таго, чым Вы займаецеся, немагчыма ўявіць тую або іншую краіну», — адзначыў ён. Менавіта гэтыя абцякальныя словы пра сустрэчу былі распаўсюджаныя па каналах дзяржаўных СМІ.

У сваю чаргу лорд Бэл, са словаў БЕЛТА, адзначыў, што на інфармацыйных інтэрнэт-рэсурсах вельмі многа няшчырых і крывадушных камэнтароў адносна Беларусі. «Наперадзе сур'ёзная работа, каб гэта выправіць», — сказаў ён.

Навіну пра сустрэчу Лукашэнкі з Бэлам зьмясьцілі міжнародныя інфармацыйныя агенцтвы і папулярныя расейскія СМІ.

Лорд Бэл у інтэрвію газэце Moscow Times прызнаў, што разьлічвае зарабіць на Беларусі «мільёны даляраў».

**Мікола Бугай**

# «Малады фронт» выйшаў з Аб'яднаных дэмакратычных сілаў

«Мы ня лічым АДС на сёньняшні дзень дзейснай і ўплывовай палітычнай структурай. Аўтарытэт арганізацыі пастаянна падае, няма адзінага лідэра. Таксама складаным выбарам для нас была супраца з Партыяй камуністаў у адной кааліцыі. Камуністы па сёньняшні дзень не пакаяліся ў сваіх злачынствах XX стагодзьдзя. Таму выхад з АДС быў для нас таксама і маральным выбарам. На дадзеным этапе мы ня бачым карысьці ў такой кааліцыі», — паведаміў актывіст гэтай незарэгістраванай у Беларусі арганізацыі Іван Шыла.

Паводле словаў салігорскага «маладафронтаўца», арганізацыя зьбіраецца супрацоўнічаць з блізкай ёй па духу Беларускай хрысьціянскай дэмакратыяй, «Рухам «За Свабоду», а таксама аргкамітэтам сацыял-дэмакратычнай партыі Міколы Статкевіча. У АДС «Малады фронт» меў два галасы.

Гэтае рашэньне было прынятае на Сойме 9 сакавіка. Тадысама адбыліся выбары кіраўніцтва «Маладога фронту». Старшынём стаў Зьміцер Дашкевіч, а ягонымі намесьнікамі Артур Фінькевіч, Іван Шыла і Наста Палажанка. Цяпер сябры арганізацыі будуць рыхтавацца да чарговага ўстаноўчага сходу «Маладога фронту», каб зноў спрабаваць афіцыйна зарэгістравацца.

**Зьміцер Панкавец**




PHOTO.BYMEDIA.NET

# Беларусаў усё меней

## Затое мы ўсё лепшыя?

На сёньняшні дзень колькасьць насельніцтва нашай краіны складае 9 мільёнаў 689 тысяч чалавек, яшчэ ў 2000 годзе жыхароў было больш за 10 мільёнаў, пра гэта паведаміў міністар статыстыкі і аналізу Ўладзімер Зіноўскі.

Летась насельніцтва Беларусі зьменшылася на 29 тысяч чалавек. На 103 тысячы народжаных прыйшлося 132 тысячы памерлых. Прырост насельніцтва назіраецца толькі ў Менску. Цяпер у сталіцы жыве 1 мільён 814 тысяч чалавек, за восем гадоў менчукоў паболела на 126 тысяч чалавек. Напрыклад, на Віцебшчыне за гэты ж тэрмін людзей паменела на 96 тысяч.

Летась на тысячу чалавек па краіне прыходзілася 9 шлюбаў і амаль 4 разводы.

Грашовыя прыбыткі насельніцтва у 2007 г. склалі 506 тысяч рублёў на душу насельніцтва. Найбольшыя прыбыткі ў Менску — 816 тысяч. Тады як на Берасьцейшчыне толькі 407 тысяч.

Сярэдні заробак у Беларусі на канец 2007 г. складаў 795 тысяч рублёў (369 даляраў ЗША). Найбольшыя сярэднія заробкі ў бюджэтнай сферы — каля мільёна. У сельскай гаспадарцы гэты паказьнік складае толькі 453 тысячы.

Сярэдні памер пэнсіі пры канцы мінулага году склаў 328 тысяч рублёў (152 даляры). Толькі 8,4 % хатніх гаспадарак маюць прыбыткі ніжэй за пражытачны мінімум. На Гомельшчыне такі паказьнік складае 12,7 %, у Менску — 2,1 %.

Чым большыя прыбыткі ў сям’і, тым меншую долю сямейнага бюджэту яна траціць на харчаваньне, і наадварот, кажа міністар. Увогуле, на прадукты беларусы выдаткоўваюць аж 41,5 % сваіх прыбыткаў, але штогод гэтая лічба меншае.

На нехарчовыя пакупкі беларусы выдаткоўваюць 34,5 %. Разам з тым, штогод расьце колькасьць набытых аўтамабіляў, лядоўняў, пральных машынаў. На сто гаспадарак цяпер прыпадае 26 кампутараў. У сем’ях, дзе ёсьць дзеці, гэты паказьнік складае 40 кампутараў.

20,7 % жыхароў краіны маюць сталы доступ да інтэрнэту. Каля 7 мільёнаў чалавек зьяўляюцца абанэнтамі кампаній мабільнай сувязі. Усё больш грошай беларусы выдзяляюць на культурныя і спартовыя відовішчы, а таксама на адпачынак. 7,4 % прыбыткаў насельніцтва летась пайшлі на накапленьне.

**Зьміцер Панкавец**



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

**15 сакавіка да гіпэрмаркету ProStore прыехалі некалькі дзясяткаў аўто, аздобленых белымі і чорнымі стужкамі, а таксама плякатамі і налепкамі з надпісам «Жывы шчыт». Аварыя, якая ўзбунтавала кіроўцаў — старонка 18.**

# Вялікі дзякуй

**Генадзю К.** зь Менскага раёну.
**Адзе Р.** з Шаркаўшчынскага раёну.
**Ніне А.** зь Берастаўіцкага раёну.
**Аляксандру Б.** з Полацку.
**Сяргею К.** зь Сеньненскага раёну.
**Мікалаю Я.** з Лагойскага раёну.
**Алегу Дз.** з Магілёва.
**Леаніду А.** з Гарадоцкага раёну.
**Андрэю Ч.** з Карэліцкага раёну.
**Лявонцію А.** з Полацкага раёну.
**Леаніду А.** з Маладэчанскага раёну.
**Валеру П., Г.П.** з Баранавіцкага раёну.
**Аляксандру Я.** зь Нясьвіскага раёну.
**Аляксандру Н.** са Слуцкага раёну.
**Анатолю М.** з Чашніцкага раёну.
**К.П., Дзьмітрыю Ш., Аркадзю М., Алегу М.** з Гомелю.
**Ларысе Р.** з Калінкавіцкага раёну.
**Антону Т., Анатолю П.** з Смалявіцкага раёну.
**Леаніду Г.** з Горадні.
**Лідзіі І., Паўлу Ч., Івану К., Уладзімеру Г., Генадзю К., Уладзімеру Г., Сьвятлане В., С.Т., П.Д., Мікалаю К., Раісе К., Казімеру Г., Аляксандру С., Рыце М., Ларысе С., Л.Г., А.М., Дзьмітрыю І., Ліліі Б., Варвары Б., Вользе Ш., Пятру Р., Т.П., Арсеню Л., Ізмаілу А., Я.К., Барысу А., Вользе К., О.М., Але К., Ніне Ш., П.С., Л.І., Канстаціну Ш., Сяргею А., А.Ш., Л.Н., Э.С.** зь Менску.

**Франц Сіўко. Дзень Бубна.** — Менск: Логвінаў, 2008. — 276 с.

Замаўляйце кнігі сэрыі «Кнігарня «Наша Ніва» праз т.: **(029) 505-39-11, (029) 126-36-87** або праз e-mail: **knihi@me.by**




ПАВЕДАМЛЕНЬНЕ

ПВУП "Суродзічы", УНП 190 786 828
МГД ААТ "Белінвестбанк", вул. Калектарная, 11, Менск, код 764

Рахунак атрымальніка: **3012 206 280 014** Асабовы рахунак: 

(прозьвішча, імя, імя па бацьку, адрас)

| Від аплаты | | | | Дата | Сума |
|---|---|---|---|---|---|
| За газэту "Наша Ніва" | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | Агулам | |

Касір

КВІТАНЦЫЯ

ПВУП "Суродзічы", УНП 190 786 828
МГД ААТ "Белінвестбанк", вул. Калектарная, 11, Менск, код 764

Рахунак атрымальніка: **3012 206 280 014** Асабовы рахунак: 

(прозьвішча, імя, імя па бацьку, адрас)

| Від аплаты | | | | Дата | Сума |
|---|---|---|---|---|---|
| За газэту "Наша Ніва" | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | Агулам | |

Касір М.П.

## Каб штотыдзень атрымліваць газэту,

дасылайце адрасы і грошы за газэту. Кошт на месяц — 8 тыс. рублёў.

1) Просім усіх ахвотных чытаць газэту **паведамляць у Рэдакцыю свае адрасы і тэлефоны. Гэта можна зрабіць праз:** тэлефоны: (017) 284-73-29, (029) 260-78-32, (029) 618-54-84, e-mail: dastauka@nn.by, паштовы адрас: 220050, г.Менск, а/с 537.

2) **Просім у блянку банкаўскага паведамленьня ці паштовага перакazу дакладна і разборліва пазначаць адрас, у тым ліку паштовы індэкс і код пад'езду.**

# Аўтаінспэктары паплаціліся пасадамі за арганізацыю «жывога шчыта»

Вінаватых у надзвычайным здарэньні на трасе Менск—Мікашэвічы пакараюць. Скандальны выпадак агаліў праблему п'янства за стырном, а таксама ўзьняў пытаньне прафэсійнай падрыхтоўкі аўтаінспэктараў. Але таксама ён узьняў і больш фундамэнтальную праблему: стаўленьня да чалавечага жыцьця і прыватнай уласнасьці ў нашай краіне.

Нагадаем, 2 сакавіка, каб спыніць п'янага кіроўцу, які нёсься па трасе Менск—Мікашэвічы з хуткасьцю 150 км/г і 40 хвілінаў уцякаў ад міліцыянтаў са Слуцку ў кірунку сталіцы, інспэктары ДАІ перагарадзілі дарогу легкавымі аўтамабілямі, не высадзіўшы адтуль людзей. Пры гэтым яны ня выкарысталі ўласных машынаў. У выніку сутыкненьня некалькі чалавек пацярпелі, адзін зь іх атрымаў чэрапа-мазгавую траўму. У аўтамабілі, на які прыйшоўся самы моцны ўдар, знаходзілася трохгадовае дзіця.

Варта адзначыць, што ад пачатку кіраўніцтва ДАІ сыходзіла ад адназначных камэнтароў наконт ДТЗ. Спробы апраўдаць дзеяньні сваіх супрацоўнікаў выклікалі абурэньне простых грамадзянаў. Кіроўцы выказвалі даішнікам свой пратэст на вуліцах сталіцы, а 15 сакавіка да гіпэрмаркету ProStore прыехалі некалькі дзясяткаў аўто, аздобленых белымі і чорнымі стужкамі, а таксама плякатамі і налепкамі з надпісам «Жывы шчыт». Прысутныя падпісаліся пад зваротам да ўладаў з патрабаваньнем разабраць здарэньне і пакараць вінаватых.



KP.BY

Віноўнік аўтааварыі Раман і яго нявеста Вольга ля загсу.

Пад ціскам СМІ, у тым ліку і дзяржаўных, а таксама грамадзкасьці, былі зробленыя пэўныя захады. Намесьнік начальніка аддзелу ДАІ Кастрычніцкага РУУС Менску і начальнік ДАІ Слуцкага РУУС, якія адказвалі за прафэсійную падрыхтоўку ўдзельнікаў затрыманьня, былі паздыманыя з пасадаў. Той жа лёс напаткаў і саміх аўтаінспэктараў. Па факце здарэньня пракуратура распачала крымінальную справу паводле ч.1 арт. 424 КК («Злоўжываньне ўладай альбо службовымі паўнамоцтвамі»). Выкарыстаныя ў якасьці жывога шчыта грамадзяне прызнаныя пацярпелымі. Яны таксама патрабуюць спагнаць зь вінаватых у ДТЗ кампэнсацыю маральнай і матэрыяльнай шкоды. 13 сакавіка ў часе прэс-канфэрэнцыі начальнік рэспубліканскай ДАІ Аляксандар Мендзелеў прынёс прабачэньні пацярпелым у аварыі.

Між тым, стала вядома, што кіроўца, якога спынялі на Слуцкай шашы «жывым шчытом», ніколі ня меў правоў на кіраваньне аўтамабілем, але за рулём ужо сем гадоў. 27-гадовы Раман быў тройчы судзімы (у тым ліку за ўгон аўто), адседзеў агулам больш за 10 гадоў. На момант пагоні ў аўто цьвярозай была толькі яго нявеста Вольга, уладальніца машыны, якая перадала кіраваньне свайму п'янаму жаніху, бо сама стамілася кіраваць. Толькі выйшаўшы з бальніцы, маладыя людзі пабраліся шлюбам. Супраць віноўніка аварыі распачатая крымінальная справа паводле ч.1 арт. 317 КК («Парушэньне правілаў дарожнага руху альбо эксплюатацыі транспартных сродкаў»), яму пагражае да двух гадоў зьняволеньня. Вользе таксама пагражае адказнасьць за незаконную перадачу кіраваньня аўто.

Скандальны выпадак агаліў праблему п'янства за стырном, а таксама ўзьняў пытаньне прафэсійнай падрыхтоўкі аўтаінспэктараў. Так, начальнік рэспубліканскай ДАІ Аляксандар Мендзелеў назваў дзеяньні дарожных інспэктараў непрафэсійнымі. Прызнаў памылку і кіраўнік МУС Уладзімер Навумаў. Аднак галоўнай прычынай здарэньня той жа А. Мендзелеў назваў п'янства, «якое ў нашай краіне робіцца ладам жыцьця».

**Сямён Печанко**

# «Паслу Ст’юарт фактычна далі 24 гадзіны»

Намесьнік дзяржаўнага сакратара ЗША Дэвід Крэймэр пра ад’езд пасла Ст’юарт на кансультацыі: «Калі ўрад Беларусі паінфармаваў нас пра сваё рашэньне, была ўжытая фармулёўка: «Мы настойліва рэкамэндуем, каб пасол Ст’юарт была выкліканая на кансультацыі ў Вашынгтон». Спачатку мы палічылі іх дэмарш рэкамэндацыяй, паколькі яны ўжылі такое слова. Мы не разглядалі іх як патрабаваньне ці ўльтыматум. Але ў аўторак мы даведаліся, што яны мелі на ўвазе, што гэта быў фактычна ўльтыматум. Паслу Ст’юарт фактычна далі 24 гадзіны, каб паехаць у Вашынгтон па кансультацыі. У выпадку адмовы яна была б абвешчаная persona non grata. І мы палічылі, што ня варта ствараць эскаляцыю канфлікту. Мы адклікалі яе на кансультацыі, каб прадухіліць вельмі драматычны крок, які беларускі бок мог бы зрабіць».

**Пасольства ЗША спыніла выдаваць візы грамадзянам Беларусі**

Гэта адбылося пасьля таго, як часоваму паверанаму ў справах ЗША ў Беларусі Джанатану Муру ў Міністэрстве замежных справаў чарговы раз настойліва рэкамэндавалі скараціць колькасьць пэрсаналу пасольства ЗША ў Менску.

«Цяпер урад Злучаных Штатаў разглядае рэкамэндацыю МЗС Беларусі ад 17 сакавіка аб скарачэньні штату супрацоўнікаў Пасольства ЗША.

У сувязі з гэтым разгляд візавых заяваў часова прыпынены, бо нашыя рэсурсы скіраваны на іншыя прыярытэты. Некаторыя ўжо прызначаныя візавыя сумоўі былі адкладзены. Паслугі грамадзянам ЗША аказваюцца ў звычайным рэжыме», — паведамляе консульская служба амэрыканскага пасольства.

У самім пасольстве ад камэнтароў адмаўляюцца, зазначаючы, што ўся інфармацыя выкладзена на сайце.



PHOTO.BYMEDIA.NET

Нагадаем, 7 сакавіка беларускія ўлады адклікалі з Вашынгтону пасла Міхаіла Хвастова. Гэта было растлумачана санкцыямі амэрыканскага боку супраць прадпрыемства «Белнафтахім».

12 сакавіка пасьля настойваньня з боку беларускага МЗС зь Менску зьехала пасол ЗША Карэн Ст’юарт.

**ЗП**

## СЬЦІСЛА

### Ломаць такі выявіў буйныя махінацыі

Старшыня Камітэту дзяржаўнага кантролю Зянон Ломаць паведаміў, што Камітэт выявіў злоўжываньні ў гандлі нафтапрадуктамі. Так, толькі два гуртовыя дастаўшчыкі паліва нанесьлі дзяржаве шкоду 40 мільярдаў рублёў. Гэтая лічба амаль роўная той, якая за два першыя месяцы сёлета паступіла ў дзяржаўны бюджэт.

### Адваката Барадзіна затрымалі ў Менску

Эмануэль Зэльцэр быў арыштаваны 12 сакавіка ў аэрапорце Менск-2 па прылёце зь Лёндану. Пра гэта паведамілі сваякі амэрыканскага адваката, які лічыцца экспэртам ў справах з адмываньнем грошай. Вядома, што Эмануэль Зэльцэр адзін час аказваў адвакацкія паслугі былому кіраўніку справамі расейскага прэзыдэнта Паўлу Барадзіну. Разам з Зэльцэрам затрыманая і сакратарка — Уладлена Функ, якая мае грамадзянства Расеі, але жыве і працуе ў ЗША. Зэльцэр упершыню ўяжджаў у Беларусь.

### Русакевіч абяцае заяўны мэтад рэгістрацыі інтэрнэт-СМІ

Міністар інфармацыі Уладзімер Русакевіч паведаміў у інтэрвію БЕЛТА, што міжведамасная камісія падрыхтавала праект указу, які будзе рэгуляваць інтэрнэт-сфэру ў Беларусі. «Было б наіўна спрабаваць накінуць аброць на сеціва, — кажа міністар. — Гаворка не ідзе пра ўвядзеньне кантролю, цэнзуры. Дакумэнт замацоўвае заяўны прынцып рэгістрацыі інтэрнэт-выданьня. Тым самым рэгуляваньне заключаецца ў рэгістрацыі сеціўнага рэсурсу як самастойнага СМІ, які мае такія ж правы, як друкаваныя СМІ. У выніку вырашыцца пытаньне пра адказнасьць, праблема захаваньня аўтарскіх правоў у інтэрнэт-выданьнях».

### Якубовіч ня сплаціць Міхалевічу

…кампэнсацыю за вядро бульбы. У панядзелак судзьдзя Савецкага суду Менску Аляксей Таманаў адхіліў пазоў палітыка Алеся Міхалевіча да газэты «Советская Белоруссия» і яе журналіста Арцёма Чалядзінскага, пад гэтым псэўданімам хаваўся галоўны рэдактар выданьня Павал Якубовіч. У газэце быў надрукаваны артыкул «Крутой мираж». Аўтар сьцьвярджаў: «Яны (індывідуальныя прадпрымальнікі — ЗП) …думаюць, што Міхалевіч-Мілінкевіч, якія ў жыцьці ня вырасьцілі… ніводнага вядра бульбы, … дапамогуць ім у спэцыфічных прадпрымальніцкіх праблемах».

А.Міхалевіч палічыў, што гэты артыкул ганьбіць ягоны гонар і запатрабаваў у «СБ» абвергнуць зьвесткі пра яго, а таксама выплаціць кампэнсацыю маральнай шкоды ў памеры цаны новага вядра для бульбы.

**Зьміцер Панкавец**

# Крах даляра

Нэрвознасьць Фэдэральнай рэзэрвовай сыстэмы ЗША, якая ў нядзелю раптоўна панізіла стаўку крэдытаваньня, выклікала паніку на сусьветных фінансавых рынках. Алан Грынспэн назваў надыходзячы фінансавы крызіс «самым балючым з моманту заканчэньня другой сусьветнай вайны».

На міжнародным рынку пабіты новы гістарычны рэкорд — курс даляра да эўра падступіў да мяжы 1,6. Шэсьць гадоў таму даляр каштаваў удвая болей. Але самае небясьпечнае для стабільнасьці міжнароднае фінансавае сыстэмы — гэта тэмп абясцэньваньня, што склаў 10% за апошнія тры месяцы.

Нэрвознасьць Фэдэральнай рэзэрвовай сыстэмы ЗША, якая ў нядзелю раптоўна панізіла стаўку крэдытаваньня, толькі павялічыла страхі на біржах. Зазвычай рада ФРС на выходных не працуе. Аднак у гэтую нядзелю ФРС панізіла стаўку па крэдытаваньні першасных дылераў з 3,5 % да 3,25 % гадавых. Хаця ў адрозьненьне ад базавай працэнтнай стаўкі гэты парамэтар не зьяўляецца ключавым для амэрыканскай гаспадаркі, рашэньне, прынятае раптоўна, ды яшчэ і ў выходныя, выклікала ў інвэстараў чарговую хвалю панікі. Яны вырашылі, што справы ў эканоміцы ЗША зусім ніякія.

Зьніжэньнем крэдытнае стаўкі ФРС імкнецца ажывіць замерлую амэрыканскую гаспадарку. Пакуль безвынікова. Не дапамагае і найніжэйшы курс амэрыканскае валюты, што стымулюе экспарт.

Упэўненасьці ў непазьбежнасьці катастрофы дадаў адзін з самых аўтарытэтных эканамістаў сьвету, былы кіраўнік ФРС ЗША Алан Грынспэн.

У артыкуле ў газэце Financial Times Грынспэн называе будучы фінансавы крызіс «самым балючым з моманту заканчэньня другой сусьветнай вайны».

Кіраўнік Міжнароднага валютнага фонду (МВФ) Дамінік Строс-Кан паведаміў у панядзелак, што эканамічны крызіс будзе доўгатэрміновым і выкліча сур'ёзныя наступствы. Аслабленьне даляра было «прадказальнай зьявай», але празь яго ступень «мы маем справу цяпер зь вельмі напружанай сытуацыяй». Пры гэтым Строс-Кан ня бачыць патрэбы, каб «цэнтральныя банкі супольна ўмяшаліся ў ходу падзеяў».

З нагоды крызісу выказаўся нават прэзыдэнт Расеі Ўладзімір Пуцін. Ён папрасіў не дапусьціць, каб умацаваньне рубля прывяло да нэгатыўных працэсаў у эканоміцы і даручыў эканамічнаму блёку расейскага ўраду пільнаваць гэта.

Пры благіх вестках з ЗША індэкс расейскай біржы ўпаў у панядзелак прыблізна на 5 %. 3,5 % страціў ў сярэднім акцыі на варшаўскай біржы.

Адначасова з падзеньнем даляра цэны на нафту перавысілі рэкордныя 112 даляраў за барэль, а цана золата — таксама рэкордныя 1033 даляры за тройскую унцыю. Інвэстары стараюцца пазбыцца даляраў і ўкладаюць грошы ва ўсё, што, так бы мовіць, доўга ляжыць.

На думку віцэ-прэзыдэнта ЗША Дыка Чэйні рост цэнаў на нафту ўсяго толькі адлюстроўвае каньюнктуру рынкаў.

Рэакцыі беларускага ўраду на турбуленцыі сусьветных рынкаў пакуль не было.

Практычна ніхто з эканамістаў не чакае ўзмацненьня даляра ў блізкай пэрспэктыве. Пануюць пэсымістычныя прагнозы наконт курсу амэрыканскай валюты.

**Мікола Бугай;**
**Сямён Печанко**

**Эканаміст Аляксандар Гатоўскі: «Беларусь — адзіная ў Эўропе верная даляру ў такі цяжкі для яго час краіна»**

Што чакае беларускую эканоміку ў сувязі з падзеньнем курсу амэрыканскага даляра? Гаворыць эканаміст Аляксандар Гатоўскі: «Беларусь — адзіная ў Эўропе верная даляру ў такі цяжкі для яго час краіна.

Зважаючы на аслабленьне курсу даляра, пачынаючы зь мінулага году, большасьць нашых суседзяў пераарыентавалася ў разьліках на моцны эўра. Нашая эканамічная палітыка застаецца нязьменнай — курс нацыянальнай валюты па-ранейшаму прывязаны да даляра. Фактычна, Беларусь — адзіная эўрапейская дзяржава, што ў такой неспрыяльнай для амэрыканскай валюты сытуацыі захоўвае ёй вернасьць. Расея вагаецца паміж далярам і эўра, але ўсё часьцей схіляецца на карысьць апошняга. За расейскія нафту і газ мы разьлічваемся ў далярах ЗША. Але трэба ўлічваць, што цана на іх вагаецца з улікам карэкціроўкі сусьветных цэнаў, якія таксама залежаць ад зьменаў курсу даляра. Таму на нашай эканоміцы падзеньне даляра адаб'ецца непазьбежна. Вымалёўваецца наступная сытуацыя: даляр падае, эўра ўмацоўваецца, цэны на імпартныя тавары і сыравіну ў далярах растуць. У выніку пацерпіць просты грамадзянін, бо заробак, які налічваецца ў беларускай валюце, замацаванай за далярам, зьменшыцца.»

# Перайшлі на эўра

Каб зьменшыць нэгатыўныя наступствы санкцыяў ЗША супраць прадпрыемстваў канцэрну «Белнафтахім», айчынныя вытворцы перайшлі на разьлікі ў эўра. Аднак не для ўсіх удзельнікаў канцэрну гэта ёсьць аптымальным выйсьцем.

Рашэньне ЗША замарозіць рахункі канцэрну «Белнафтахім» у лістападзе мінулага году выклікала ў яго кіраўніцтва шокавы стан.

Сур'ёзна пабойваўся тады і «Беларуськалій», што яго ўключаць у «чорны сьпіс»: 80% усіх разьлікаў кампанія зьдзяйсьняе менавіта ў далярах ЗША. Да ўсяго санкцыі могуць прывесьці да згортваньня дзейнасьці на надзвычай прыбытковым амэрыканскім рынку.

Тым часам, гарадзенскі «Азот» і нафтаправод «Дружба» ўжо перайшлі на разьлікі ў эўра.

**Сямён Печанко**

# Сярэдняя зарплата ў Польшчы дасягнула 1340 даляраў

У нашых суседзяў заробкі растуць рэкорднымі тэмпамі.

У лютым сярэдні паляк зарабляў ужо 3033 злотых. У злотых гэта на 11% болей, чым у сьнежні. Але падзеньне даляра яшчэ прымножыла памер заробку ў даляравым эквіваленце. Тры месяцы таму за адзін даляр давалі 2,55 злотага, цяпер ужо — усяго 2,26.

Нягледзячы на трывожныя прыкметы спаду ў амэрыканскай эканоміцы, краіны Цэнтральнай Эўропы па-ранейшаму растуць як на дражджах. Тэмпы росту ў пераліку на год у Польшчы складаюць 6,5 %, а ў Літве — цэлыя 8.

Прыход да ўлады ў Польшчы, найбольшым рынку Цэнтральнай Эўропы, ураду Грамадзянскай плятформы і Сялянскай Партыі, складзенага зь лібэралаў і аграрнікаў, таксама ўдыхнуў у бізнэс аптымізм.

Праўда, у паяднаньні з ростам сусьветных цэнаў на нафту і, адпаведна, сельгаспрадукты (перапрацоўка іх на этанол прывязала цэны на іх да цэнаў на энэрганосьбіты) бурны эканамічны рост правакуе інфляцыю. Нягледзячы на прывязку літа да эўра і стабільны курс злотага, спажывецкія цэны растуць у Польшчы ў тэмпе 3,4 % за год, у Літве — нават вышэй за 11 %.

Для параўнаньня: сярэдняя зарплата ў Беларусі ў студзені склала 335 даляраў, інфляцыя ў студзені—лютым у пераліку на гадавы паказчык — каля 12 %, дэклараваныя тэмпы росту ВУП — 9,9 %.

**Мікола Бугай**

**Заробкі ў супастаўленьні**

**Па велічыні сярэднямесячнага заробку сярод краін СНД Беларусь займае трэцяе месца пасьля Расеі і Казахстану, паведаміў міністар статыстыкі і аналізу Уладзімер Зіноўскі. Паводле яго зьвестак, у Расеі ў 2007 г. сярэднямесячны заробак склаў $529, у Казахстане — 434, у Беларусі — 326, ва Украіне — 268.**

## СЬЦІСЛА

### 33,5 % замежных інвэстыцый — з Расеі

У 2007 Расея інвэставала ў беларускую эканоміку каля $1,8 млрд (33,5% ад агульнага аб'ёму інвэстыцый), паведаміў кіраўнік МЗС Беларусі Сяргей Мартынаў. Вялікабрытанія ўклала ў Беларусь $860,7 млн (15,9%), Швайцарыя — $606,4 млн (11,2%), Аўстрыя — $594,3 млн (11%). Усяго за мінулы год у Беларусь патрапіла каля $5,4 млрд. Варта адзначыць, што 44,2% усіх наўпроставых інвэстыцый, ці $580,3 млн, складаюць сродкі Швайцарыі.



PHOTO.BYMEDIA.NET

У Менску пачаўся сэзон вулічнага гандлю садавінай і гароднінай.

### Новыя падзямельныя паркінгі ў Менску

У цэнтры Менску маюць збудаваць некалькі падземных парковак. Паркінгі на ўзор збудаванага пад плошчай Незалежнасьці маюць зьявіцца на вуліцы Янкі Купалы ля Сьвіслачы і пад Кастрычніцкай плошчай. Апроч парковачных месцаў, пад зямлёй аўтамабілістам збудуюць запраўкі, крамы аўтазапчастак, дыягнастычныя канторы, інтэрнэт-кавярні, крамы, і нават боўлінг ды казіно.

**СП; БЕЛТА, БелаПАН**

# «Прессбол» падаў у суд на «Спортивную панораму»

Галоўны рэдактар найбуйнейшай спартовай газэты краіны «Прессбол» Уладзімер Беражкоў падаў у суд на «Спортивную панораму». Беражкоў спадзяецца ў судзе Цэнтральнага раёну сталіцы абараніць свой гонар, годнасьць і дзелавую рэпутацыю.

У нумары «Спортивной панорамы» ад 13 сакавіка было надрукаванае інтэрвію з дырэктарам НДІ фізычнай культуры і спорту А.Бондарам пад назовам «Сэнсацыя другой сьвежасьці». Сярод іншага суразмоўца адзначыў: «У 1996 годзе, калі Рыжанкова (першы міністар спорту Беларусі — «НН») ня стала, пасьля Гульняў у Атланце праходзіў Алімпійскі сход. Беражкоў выбачыўся за жорсткую крытыку гэтага чалавека, прызнаўшы частковую віну ў ягонай сьмерці».

Беражкоў патрабуе:

1) Вызначыць у судовым парадку аўтара артыкула, які падпісаны «наш кар.», каб прыцягнуць яго да адказнасьці;

2) Абвергнуць у газэце гэтую інфармацыю;

3) Спагнаць з адказчыка 50 мільёнаў рублёў маральнай кампэнсацыі.

Сам Уладзімер Беражкоў так пракамэнтаваў рашэньне зьвярнуцца ў суд: «Мяне гэта проста абразіла. Каб зьвесьці са мной і «Прессболом» рахункі ў ходу ідзе ўсялякая зброя. Я доўга цярпеў і




ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

не паддаваўся на такія рэчы, заплюшчваў вочы, але больш цярпець не магу. Мяне проста гэта кранула і абурыла да глыбіні душы. Проста нельга пераступаць праз сьвятое, праз нябожчыка. Ня важна, рэальна, ці нерэальна выйграць гэты суд. Здаецца, і так відавочна, хто тут мае рацыю. А наколькі хопіць адміністратыўнага рэсурсу ў гэтых чыноўнічкаў, не мая справа», — кажа У.Беражкоў.

Нагадаем, што 28 лютага аргкамітэт НАК пазбавіў «Прессбол» дзьвюх акрэдытацый на Алімпійскія гульні ў Пэкін. Прычынай стаўся артыкул Сьвятланы Парамыгінай «Алімпійская сьметніца». У матэрыяле журналісткі гаворка ішла акурат пра фінансавыя махінацыі ў НДІ фізычнай культуры і спорту.

У падтрымку «Прессбола» ўжо выказаліся некалькі дзясяткаў былых і сёньняшніх мэдалістаў Алімпіядаў і чэмпіянатаў сьвету.

**Зьміцер Панкавец**

# У Магілёве сакратар пярвічкі БРСМ выйшла з арганізацыі

Вучаніца 10 клясы СШ № 43 Ганна Леўшукова зьняла зь сябе паўнамоцтвы сакратара арганізацыі. Гэта — пратэст супраць прымусовай БРСМізацыі старэйшых клясаў. «Яшчэ два тыдні таму, — гаворыць Ганна, — колькасьць сяброў БРСМ у нашай школе складала 86 чалавек. Цяпер жа іх ужо 193. Два гады назад, калі я стала сакратаром першаснай арганізацыі, сакратар гарадзкога камітэту БРСМ Іна Караткевіч мне казала, што ніхто нікога заганяць у арганізацыю прымусова ня будзе, але на справе ўсё аказалася ня так».

Адразу пасьля свайго ўчынку школьніца была выкліканая на размову да дырэктара школы, але не передумала. «Большасьць маіх сяброў віталі маё рашэньне і загарэліся аналягічным жаданьнем, — кажа яна. — Пасьля таго, як я зьняла зь сябе паўнамоцтвы сакратара БРСМ, мне стала лягчэй дыхаць», — падсумоўвае Ганна.

**Вітольд Няўрыда, bulletinonline.org**

## СЬЦІСЛА

### Міністар фінансаў з інсультам

Гэта здарылася ў ноч на 14 сакавіка. 59-гадовы Мікалай Корбут быў дастаўлены ў Рэспубліканскую бальніцу Кіраўніцтва справаў прэзыдэнта. Стан хворага ацэньваўся як цяжкі.

### Ніл Гілевіч пайшоў на папраўку

Народны паэт Беларусі Ніл Гілевіч перанёс мікраінсульт. Брат Ніла Сымонавіча Мікола Гіль кажа: «Дзякаваць Богу, яму ўжо лепей. Цяпер ён у нэўрахірургічным аддзяленьні 5-й гарадзкой бальніцы. Найхутчэй, што прабудзе там да панядзелка ці аўторка, пасьля чаго яго зноў перавядуць у лечкамісію. Мікраінсульт сапраўды быў, але, на шчасьце, бяз значных наступстваў. Ніл сам ходзіць, на гаворцы гэта таксама не адбілася», — кажа М.Гіль.

**Зьміцер Панкавец**

## 11 сакавіка

### Запалохваюць Зарамбюка

Актывіст нацыянальнага руху з Мастоў **Алесь Зарамбюк** цягам дзьвюх з паловай гадзін знаходзіўся на гутарцы ва ўпраўленьні КДБ па Гарадзенскай вобласьці. Размову вёў капітан **Алег Жывушка**, у кабінэце таксама прысутнічаў невядомы, які не прадставіўся. Зарамбюку паказалі ягоныя фатаздымкі з ушанаваньня памяці братоў Каліноўскіх у Сьвіслачы 27 кастрычніка, а таксама з сустрэчы з Аляксандрам Мілінкевічам у Мастах 4 лістапада мінулага году. Палітыка папярэдзілі аб крымінальнай адказнасьці паводле арт. 342 КК «Арганізацыя і падрыхтоўка дзеяньняў, якія груба парушаюць грамадзкі парадак». Гэта другі візыт А. Зарамбюка ў КДБ, першы быў летась падчас сьледзтва паводле крымінальнай справы незарэгістраванага «Маладога фронту».

## 12 сакавіка

### Цянюта скардзіцца Жадобіну

Падазраваны ў крымінальнай справе незарэгістраванай арганізацыі «Малады фронт» гомельскі актывіст **Андрэй Цянюта** накіраваў скаргу старшыні КДБ **Юр'ю Жадобіну**. Ён скардзіцца на дзеяньні сьледчага ўправы КДБ па Гомельскай вобласьці **Дзьмітрыя Сядлярава**. А.Цянюта растлумачыў, што сьледзтва ў дачыненьні да яго ідзе з 26 верасьня 2007 г., але дагэтуль абвінавачаньне не прад'яўленае. За гэты час актывіст быў дапытаны толькі чатыры разы. Папярэдняе сьледзтва двойчы прыпынялася «за немагчымасьцю высьветліць і дапытаць асобаў, датычных да незарэгістраванай арганізацыі». А. Цянюта просіць адмяніць пастановы сьледчага аб прыпыненьні папярэдняга сьледзтва паводле крымінальнай справы і вызнача́цца — або спыніць крымінальны перасьлед, або прад'явіць абвінавачаньне.

## 13 сакавіка

### Абрабавалі газэту «Белорусы и рынок»

Не прайшло і двух дзён ад вымушанага пераезду аналітычнага штотыднёвіка **«Белорусы и рынок»** на новае месца дысьлякацыі, як рэдакцыю наведалі непажаданыя госьці. У ноч на 13 сакавіка ў памяшканьні папрацавалі злодзеі. Паводле галоўнага рэдактара газэты **Вячаслава Хадасоўскага,** злодзеі пазбавілі рэдакцыю некалькіх кампутараў. Тым ня менш, чарговы нумар газэты, як звычайна, выйшаў у панядзелак.

### Сяргея Парсюкевіча афіцыйна абвінавацілі

Лідэру віцебскіх прадпрымальнікаў **Сяргею Парсюкевічу** пракуратура высунула афіцыйнае абвінавачаньне паводле арт. 364 («Гвалт альбо пагроза гвалту ў адносінах да работніка міліцыі») КК РБ. С.Парсюкевіч быў арыштаваны 4 сакавіка нібыта за «гвалтоўныя дзеяньні супраць супрацоўніка міліцыі». Раней яго затрымалі за ўдзел у мітынгу прадпрымальнікаў у Менску ды асудзілі на 15 сутак арышту. 21 студзеня прадпрымальніка нібыта жорстка зьбіў супрацоўнік спэцпрыёмніка, пасьля чаго вязьню выклікалі хуткую дапамогу. Аднак пазьней міліцыянт сам абвінаваціў С.Парсюкевіча ў тым, што арыштант яго зьбіў. Апошняе выглядае тым менш імаверным, што С.Парсюкевіч сам быў супрацоўнік МУС.

### Сьвятару загадалі разбурыць свой дом

Пастар пратэстанцкай царквы «Новае жыцьцё» **Вячаслаў Ганчарэнка** атрымаў прадпісаньне з Адміністрацыі Цэнтральнага раёну Менску разбурыць свой прыватны дом на вуліцы Рэпіна. Намесьнік кіраўніка адміністрацыі **Зьміцер Навіцкі** спасылаецца на тое, што дом выкарыстоўваецца не паводле прызначэньня, і рэканструкцыя будынку зробленая без дазволу. В. Ганчарэнка лічыць, што прэтэнзіі спадара Навіцкага ёсьць супадзеньнем уласных інтарэсаў чыноўніка-бізнэсоўца з палітыкай уладаў у дачыненьні да царквы. Паводле прадпісаньня, пастар мусіць разбурыць свой дом да такой ступені, каб ён выглядаў як той, які быў тут восем гадоў таму. Зрабіць гэта трэба да 18 сакавіка.

### АГП адмаўляюць у памяшканьні для зьезду

Аб'яднанай грамадзянскай партыі пакуль не атрымалася дамовіцца наконт арэнды залі для правядзеньня зьезду 20 красавіка. На сёньня ўжо атрыманыя больш за дзясятак адмоваў ад розных установаў Менску. Сярод іх Рэспубліканскі культурна-асьветніцкі цэнтар, Палац культуры вэтэранаў, ДК ім. Н.Шарко («Беларускае таварыства глухіх»), бібліятэка ім. Купалы, Беларускі дзяржаўны аграрны тэхнічны ўнівэрсытэт (БДАТУ), Інстытут правазнаўства і іншыя. У якасьці прычын адмовы называецца занятасьць заляў у дзень правядзеньня зьезду.

### Ірыну Казуліну намінавалі на прэмію Кенэдзі

Беларускія праваабаронцы выступілі з ініцыятывай намінаваць **Ірыну Казуліну** на прэмію **Робэрта Кенэдзі**. Гэтай прэміяй фонд імя Робэрта Кенэдзі ўшаноўвае праваабаронцаў, якія зрабілі значны ўнёсак у барацьбу за правы чалавека. Прэмія ўручаецца штогод. «Ірына Казуліна ахвяравала сваім жыцьцём дзеля дэмакратыі і вартая гэтай адзнакі», — заявіла праваабаронца **Людміла Гразнова**. Паводле яе словаў, ініцыятыву падтрымалі таксама праваабаронцы Раіса Міхайлоўская, Эніра Браніцкая, Алег Волчак, Юры Чавусаў, Гары Паганяйла, Алена Танкачова, Ігар Рынкевіч.

## 14 сакавіка

### На канцэрце N.R.M.

Дваіх гомельскіх актывістаў апазыцыі затрымалі ў суботу на абсалютна легальным канцэрце гурту N.R.M., які праходзіў у мясцовым Доме культуры. 32-гадовага **Кастуся Жукоўскага** скруцілі адразу чацьвёра — два міліцыянты і два чалавекі ў цывільным, — калі той на ўваходзе ў залю раздаваў улёткі з інфармацыяй пра Беларускую Народную Рэспубліку. Затрымалі таксама 21-гадовую дзяўчыну — **Марыю Тульжанкову**. Усе выходныя актывісты правялі ў сьледчым ізалятары. Актывістаў абвінавацілі ў дробным хуліганстве. К. Жукоўскі абвесьціў галадоўку.

## 15 сакавіка

### Затрыманьні ў Магілёве і Бабруйску

Актывіст партыі БНФ **Сяргей Нягацін** правёў ноч у Магілёўскім ІЧУ. Міліцыянты затрымалі яго побач з пад'ездам ягонага дому нібыта за тое, што ён быў п'яны й лаяўся матам. Наркалягічная экспэртыза аднак не праводзілася. Паводле словаў затрыманага, міліцыянты без складаньня пратаколу канфіскацыі забралі некалькі дзясяткаў асобнікаў газэты «Магілёўскі час». Старонка гэтай газэты прысьвечаная праблемам «хрушчовак» у Магілёве. На наступны дзень у Ленінскім судзе адбыўся суд, на які не зьявіліся міліцыянты, што затрымлівалі Нягаціна. Дзяжурная судзьдзя **Тацяна Рубіс** перанесла разгляд справы на 27 сакавіка.

У Бабруйску былі затрыманыя актывісты, якія ехалі ў Старыя Дарогі на адкрыцьцё помніка заснавальнікам БНР. Паводле адной з затрыманых **Ірыны Міцуры**, міліцыянты ў машыне ўбачылі пачак газэт «Новы час» і загадалі кіроўцу праехаць у аддзел міліцыі. Там з кожным правялі прафіляктычную гутарку й склалі пратакол канфіскацыі на адну тысячу асобнікаў газэты «Новы час».

### Узялі Касьпяровіча

У Менску затрымалі прадстаўніка аргкамітэту па стварэньні Беларускага камітэту ў абарону правоў зьняволеных «Над бар'ерам» **Зьмітра Касьпяровіча**. Як паведаміў ягоны калега **Цімох Дранчук**, Касьпяровіча спынілі супрацоўнікі ДАІ, калі ён знаходзіўся за стырном свайго аўтамабіля ў раёне станцыі мэтро «Акадэмія навук». Паводле Дранчука, Зьмітра затрымлівалі тры аўто ДАІ, у якіх акрамя супрацоўнікаў міліцыі, ужо знаходзіліся панятыя. Пры надглядзе ў машыне Касьпяровіча былі выяўленыя налепкі з заклікам падтрымаць ініцыятыву «Эўрапейская Беларусь» і арганізацыю «Малады фронт», зарэгістраваную ў Чэхіі.

## 16 сакавіка

Увечары на Кастрычніцкай плошчы 17 чалавек правялі пікет у падтрымку палітвязьняў. Сярод пікетоўцаў былі прыхільнікі **Аляксандра Казуліна**, а таксама актывісты незарэгістраванай арганізацыі «Ініцыятыва», сябрам якой зьяўляецца **Андрэй Кім**. У пікеце таксама былі дачка **Казуліна Вольга**, маці **Андрэя Кіма** і браты **Сяргей і Аляксандар Скрабцы**. Людзі трымалі ў руках партрэты Казуліна і Кіма. Акцыя доўжылася некалькі хвілінаў, потым удзельнікі разышліся.

## 17 сакавіка

### Жукоўскага асудзілі на суткі, Тульжанкову аштрафавалі

Суд Цэнтральнага раёну Гомелю прысудзіў **Марыі Тульжанковай** штраф памерам 10 базавых велічынь (каля 170 долараў). Такі самы штраф далі і **Кастусю Жукоўскаму**, але выправілі яго назад у турму — на 14 сутак. Ён выразьшў працягнуць галадоўку, распачатую адразу пасьля затрыманьня.

### Рэзкае зьніжэньне пакупніцкага попыту

Аб'екты гандлю і прадпрыемствы грамадзкага транспарту выстаўляюць новыя рахункі ўдзельнікам акцыі прадпрымальнікаў 10 студзеня. **«Менскtранс»** ацаніў свае страты ад 14 да 18 гадзінаў 10 студзеня ў памеры 24,2 мільёна рублёў, **прыватныя перавозчыкі** — 1,6 млн рублёў, **ГУМ** — 52,1 млн рублёў, **гандлёвы цэнтар «Сталіца»** — 45,5, **унівэрсам «Цэнтральны»** —13,7, **ААТ «Узвышша»** — 3,2, **ААТ «Ласунак»** — 2,9 млн. **Агульная сума**, якую патрабуюць кампэнсаваць ад удзельнікаў прадпрымальніцкай акцыі цяпер роўная **143,5 млн рублёў.** «У выніку стварэньня напружанай псыхалягічнай абстаноўкі ў раёнах правядзеньня мітынгу і абмежаваньня праходу пакупнікоў да гандлёвых аб'ектаў, размешчаных побач зь месцам мітынгу, было адзначанае рэзкае зьніжэньне пакупніцкага попыту», — адзначаецца ў матэрыяле крымінальнай справы.

### БНР у Крычаве

Крычаўскі райвыканкам забараніў праводзіць урачысты мітынг да 90-х угодкаў абвяшчэньня незалежнасьці Беларускай Народнай Рэспублікі. У адказе за подпісам першага намесьніка старшыні райвыканкаму **Сяргея Марозава** гаворыцца, што ініцыятары не падалі заяўкі ў вызначаны заканадаўствам тэрмін — за 15 дзён да мерапрыемства.

**СП**

# Пунсавее Тыбэт

Ёсьць тэмы, асабліва нелюбімыя палітыкамі — і на Ўсходзе, і на Захадзе. Перыфразуючы Кіплінга, у гэтым яны могуць сысьціся. Піша **Віталь Тарас**.

Ёсьць тэмы, асабліва нелюбімыя палітыкамі — і на Ўсходзе, і на Захадзе. Перыфразуючы Кіплінга, у гэтым яны могуць сысьціся. Не, гэта не правы чалавека. Уратаваць лёс чалавека, або нават цэлай групы людзей — ганаровая місія, на якую кіраўнікі заходніх краінаў часам здольныя. Інакш выглядае справа, калі гаворка ідзе пра лёс малой нацыі, праве на самавызначэньне. Як у Косаве, напрыклад. Або ў Тыбэце.

Кіраўніцтва КНР лічыць Тыбэт неад’емнай часткай сваёй тэрыторыі, а ўсе спробы тыбэтцаў вярнуць хоць бы культурную аўтаномію — сэпаратызмам. У хваляваньнях у Лхасе ў 49-ю гадавіну паўстаньня ў Тыбэце ўлады КНР абвінавацілі тыбэтцаў. Паводле афіцыйнага Пэкіну, там загінулі дзесяць чалавек — усе, нібыта, этнічныя кітайцы, тамтэйшыя бізнэсоўцы. Паводле відавочцаў, загінулі дзясяткі людзей — у асноўным ад рук паліцыянтаў і вайскоўцаў. Сапраўдных зьвестак мы пакуль ня ведаем праз інфармацыйную блякаду. Кітай заблякаваў на сваёй тэрыторыі нават інтэрнэт-сайт, што разьмяшчае відэаінфармацыю, — YouTube.

Цяжка спрачацца з кіраўніцтвам краіны, насельніцтва якой пераваліла за 1 мільярд 200 мільёнаў чалавек, дзе тэмпы росту эканомікі — сярод самых высокіх у сьвеце і дзе не чакаецца рэцэсія.

Але ўсё-такі ёсьць, прынамсі, адзін чалавек, які процістаіць сваім маральным аўтарытэтам магутнай ядзернай дзяржаве, трэцяй паводле тэрыторыі ў сьвеце. Гэта Тэнцзін Г’ямцхо. Ён жа — духоўны лідэр тыбэтцаў і ўсіх будыстаў Далай-лама, які жыве ў выгнаньні.

### 14-я рэінкарнацыя Буды

Убачыць Далай-ламу мне пашчасьціла некалькі гадоў таму на міжнароднай канфэрэнцыі ў Празе, скліканай пад эгідай тагачаснага прэзыдэнта Чэхіі Вацлава Гаўла. Многія палітыкі і журналісты, дарэчы, абвінавачвалі яго тады ў тым, што сваім запрашэньнем тыбэцкага лідэра Гавал, нібыта, паставіў пад удар чэска-кітайскія стасункі…

Але больш запомнілася ня гэта. (Уражаньні ад сустрэчы ўвайшлі ў адзін з разьдзелаў маёй кнігі «Звыклае зло».)

Як ні дзіўна, зь цягам часу ўспамін ня блякне. Памятаю, найперш, тое, як Далай-лама рухаўся ў сваім экзатычным адзеньні — плаўна, велічна і ў той жа час імкліва, так што ахоўнікі і фотакарэспандэнты мусілі амаль бегчы за ім. Запомніўся выраз твару — чымсьці падобнага на тыбэцкі сьвятарны манускрыпт — бышцам бы безабаронна-дзіцячы, але, разам з тым, мужны і спакойны.

Такі выраз я потым бачыў у тэлерэпартажах з М’янмы на тварах паўсталых будыйскіх манахаў, якія ішлі па вуліцах застылага ад страху Янгону. Ішлі насустрач арыштам і сьмерці. Колькі іх загінула летась ад рук вайскоўцаў — дагэтуль таксама не вядома.

Афіцыйны Пэкін звыкла абвінаваціў Далай-ламу ў тым, што ён стаіць за хваляваньнямі ў Тыбэце, і ў спробах «раскалоць Кітай». Усьлед за ўладамі да крытыкі далучыўся Панчэн-лама (другая паводле значэньня асоба ў будыйскай духоўнай ерархіі) Г’ялцэн Нарбу: «Дзеяньні паўстанцаў ня толькі нанесьлі шкоду інтарэсам дзяржавы і народу, але таксама парушылі прынцыпы будызму». Панчэн-лама выбраны кітайскімі ўладамі, жыве ў КНР і таму вымушаны падтрымліваць камуністычнае кіраўніцтва. Што да «прынцыпаў будызму», дык гэтыя словы гучаць цікава ў сувязі з тым, што ў Кітаі нядаўна прыняты закон, паводле якога вышэйшыя аўтарытэты будызму павінныя ўхваляцца кітайскімі ўладамі.

Варта нагадаць, што Далай-лама — гэта не пасада. Гэта рэінкарнацыя Буды, бадгісатва. Цяперашні духоўны лідэр — ягоная 14-я рэінкарнацыя. Калі Далай-лама паміраe, будыйскія манахі шукаюць прыкметы «маленькага Буды» сярод людзей, якія жывуць блізу месца сьмерці папярэдніка. Праблема ў тым, што цяперашні Далай-лама ня можа вярнуцца ў Тыбэт. Таму ён выказаў нядаўна думку, што наступны Далай-лама не абавязкова будзе тыбэтцам і што ён можа быць, насуперак традыцыі, абраны аўтарытэтнымі вернікамі. Прыкладна так, як абіраюць Папу Рымскага. Але ў кожным выпадку, вырашаць гэта павінныя самі вернікі, адпаведна законам іхнай рэлігіі, а не дзяржаўныя чыноўнікі.

У будыстаў няма гіерархіі ў звыклым значэньні слова, у іх няма паняцьця «галоўны». Далай-лама — гэта найвышэйшы духоўны аўтарытэт, і прысвоіць яго сабе не пад сілу нават усямоцнай дзяржаўнай машыне.

### Вялікае разубрэньне

Далай-ламу было 19 (на год болей, чым цяперашняму Панчэн-ламу) калі ён у верасьні 1954 году прыехаў у Пэкін у якасьці дэлегата Ўсекітайскага сходу народных прадстаўнікоў. Гэта адбылося праз чатыры гады пасьля камуністычнага ўварваньня ў Тыбэт. У Пэкіне з Далай-ламам шмат разоў сустракаўся Мао Цзэдун, спрабуючы заваяваць сымпатыі маладога духоўнага лідэра.

Пра гэта пішуць Юн Чжан і Джон Галідэй у сваёй знакамітай кнізе, выдадзенай некалькі гадоў таму на Захадзе (Jung Chang and Jon Halliday «Mao: The Unknown Story»). Яны прыводзяць урывак зь ліста Мао ў адказ на ліст Далай-ламы, які той прыслаў з Тыбэту ў 1955-м (тут і далей цыт. паводле расейскага перакладу: «Неизвестный Мао», М., «Центрполиграф», 2007 — **В.Т.**). «Я часта сумую па тых цудоўных часах, калі Вы былі ў Пэкіне. Калі я змагу ўбачыць Вас ізноў?.. Я быў такі шчасьлівы, калі ўбачыў пакладзеную ў канэрту тыбэцкую кветку… У сваю чаргу, я накіроўваю Вам сваю кветку…»

Але ўжо на пачатку 1956-га году, калі завяршылася будаўніцтва дарог з цэнтральнага Кітаю ў Тыбэт, абмен кветкамі скончыўся. Мао стаў патрабаваць ад тыбэтцаў прадукты, хацеў забараніць рэлігію. Пачалося паўстаньне, якое цэнтральны ўрад задушыў з дапамогай цяжкай артылерыі і авіяцыі. Але паўстанцы колькасьцю каля 60 тысяч чалавек, у большасьці сваёй вершнікі, прадэманстравалі мужнасьць і ўменьне ваяваць. А самае галоўнае — тыбэтцы, як пішуць Чжан і Галідэй, востра адчувалі сваю самабытнасьць, захоўвалі сваю мову і рэлігію.

10 сакавіка 1959 году, калі пайшлі чуткі, што кітайцы хочуць выкрасьці Далай-ламу, у Лхасе ўспыхнула новае паўстаньне. Дэманстранты прайшлі па вуліцах гораду, выкрыкваючы: «Кітайцы, прэч!» Мао дазволіў тады Далай-ламу ўцячы ў Індыю, бо пабойваўся, што ягонае забойства можа выклікаць хвалю гневу ва ўсёй міжнароднай супольнасьці, асабліва ў будыйскіх краінах.

Паўстаньне было патопленае ў крыві. Першым вынікам камуністычных рэквізыцыяў стаў нечуваны ў гісторыі Тыбэту голад. Пра гэта напісаў у 1962-м годзе ў сваім лісьце з 70 тысяч словаў

Чжоў Эньлаю тагачасны Панчэн-лама. Падчас наведваньня тыбэцкіх раёнаў ён пабачыў, што ў людзей забралі нават посуд. «Тыбэтцы ніколі не былі нагэтулькі бедныя, каб не маглі сабе дазволіць місак для ежы», — пісаў ён. Але пра самае галоўнае Панчэн-лама змог напісаць толькі па сьмерці Мао. «15—20 працэнтаў тыбэтцаў, бадай, палову ўсіх дарослых мужчынаў, кінулі ў турмы, дзе яны памерлі ў выніку непасільнай працы. Зь імі абыходзіліся горш як з жывёламі… Зьверствы суправаджаліся зьнішчэньнем культуры. У рамках разгорнутай кампаніі, афіцыйна названай «Вялікае разбурэньне», жорстка зьнішчаўся тыбэцкі лад жыцьця за «адсталасьць, бруд і бескарыснасьць» (тамсама — В.Т.) «Сьвятарныя манускрыпты пайшлі на арганічныя ўгнаеньні, а з выяваў Буды і сутраў рабілі абутак», — пісаў Панчэн-лама. Большасьць манастыроў былі разбураныя. Паводле ацэнкі сьвятара, іх колькасьць скарацілася з 2500 ў 1959 годзе да ўсяго 70 ў 1961-м.

Асаблівым зьдзекам сталася забарона тыбэтцам хаваць памерлых паводле сваіх звычаяў.

## О спорт — ты мір!

Падсумоўваючы ўсё гэта, можна сказаць, што ў Тыбэту ня проста забралі нацыянальную незалежнасьць і культурную ідэнтычнасьць. У Тыбэце была зьнішчаная цэлая цывілізацыя.

Духоўныя традыцыі Тыбэту, між тым, зрабілі моцны ўплыў у XX стагодзьдзі, хоць і ўскосна, на цывілізацыю Захаду, які нясе сваю долю адказнасьці за лёс тыбэтцаў.

Нягледзячы на хвалю пратэстаў, якая пракацілася ад Эўропы і ЗША да Расеі, ніякія санкцыі Кітаю з боку дзяржаваў «вялікай восемкі», вядома, не пагражаюць. Адзінае, чым заклапочаныя ўлады КНР — дык гэта магчымымі наступствамі падзеяў у Тыбэце для іміджу Алімпіяды-2008 у Пэкіне. Пры канцы сакавіка павінна адбыцца ўрачыстая цырымонія дастаўкі алімпійскага агню на вяршыню Эвэрэсту ў Гімалаях, на мяжы з Тыбэтам. Кітай узмацняе на мяжы меры бясьпекі, узыходжаньні альпіністаў на самую высокую гару сьвету часова забароненыя. Так, відаць, у Кітаі разумеюць місію міру, якую закліканыя несьці Алімпійскія гульні.

Чакаць байкоту Алімпіяды з боку Захаду, як гэта адбылося ў 1980 годзе ў Маскве, не даводзіцца. Тады ішла поўнамаштабная вайна ў Аўганістане, куды Савецкі Саюз увёў свой «абмежаваны кантынгент», чым дэстабілізаваў міжнародную сытуацыю. Сытуацыю ў Тыбэце Захад лічыць унутранай справай КНР, зь якім зусім ня хоча сварыцца.

Цяперашняя Расея менш за ўсіх зацікаўленая ў якіх-небудзь байкотах — яна заклапочаная ўласнай зімовай Алімпіядай 2014 году ў Сочы.

Пра афіцыйны Менск зь яго арыентацыяй на самае шырокае супрацоўніцтва з Пэкінам у дадзеным выпадку няма чаго й казаць.

Ну, а большасьці беларусаў давядзецца быць, як заўсёды, усяго толькі заўзятарамі ды сачыць за ходам будучай Алімпіяды. Урэшце, не перашкодзілі ж зьверствы вайсковай хунты ў Аргентыне ў 1978-м заўзятарам розных краінаў з асалодай назіраць за футбольным чэмпіянатам сьвету.



# Моцарт, сын палка



## Жыцьцё, расьпісанае на аркестравыя партыі

17 сакавіка заля Купалаўскага тэатру ўжо ніяк не была настроеная на сур'ёзны спэктакль. Чакалі нейкую камэдыю пра генія, што зьбег з вар'ятні. Сярод гледачоў асабліва вылучалася моладзь, што жавала гумку: хлопцы з завушніцамі і дзяўчаты, нафарбаваныя пад Сьвятлану Зелянкоўскую. Піша **Аляксандар Фядута**.

Найцяжэй глядзець спэктаклі паводле п’есаў сучасных аўтараў. Ідзеш на Гальдоні, Шэксьпіра, Дударава-Марцінкевіча — і разумееш, што пабачыш усясьветную клясыку, хаця і не без рэжысэрскіх выкрутасаў. А тут — нейкая Марыя Ладо! Што нам усім гэтая Гэкуба?!

Гэтая «Гэкуба» напісала найноўшую варыяцыю нават не гогалеўскага «Рэвізора», а «Прыежджага з сталіцы» Грыцька Квіткі-Аснаўяненкі. У таго пя’нага актора, што патрапіў у ДТЗ (паводле мерак XIX ст., зразумела), прымаюць за важнага чалавека. Тут за заежджага гастралёра прымаюць апантанага Моцартам юнака, што зьбег зь мясцовай вар’ятні. І дазваляюць яму кіраваць аркестрам.

У выніку выходзіць выбуховая сумесь Фэліні, Ануя (абодва мэтры вызначыліся ў «аркестравай» тэматыцы), Аснаўяненкі і дакладна ўжо Гогаля — балазе, Сяргей Краўчанка грае заключную сцэну свайго інспэктара аркестру, дакладна аднаўляючы памятны маналёг Антона Антонавіча Сквозьнік-Дмуханоўскага: «З чаго сьмеяцеся?» І гэта б цалкам задаволіла тую моладзь, што сабралася ў залі і была гатовая спачатку рэагаваць на пацешныя жарцікі і крыўляньні, безь якіх такія асацыятыўныя альбо асучасьненыя пастаноўкі абысьціся ня могуць (прыгадваецца, на «Дэмэтрыюсе» ў РДТ нераз сьвятло пагасла, дык спадарыня Клебановіч хіба што анэкдоты не пачала расказваць — абы глядач не запанікаваў).

Тым больш што выканаўца ролі зьбеглага з вар’ятні Маэстра Раман Падаляка з самага пачатку спрабаваў дэманстраваць залі шалёныя вочы, надрыўна раўсьці і граць перапады ад брутальнага і мала чым апраўданага гневу да прыступаў настолькі ж мала апраўданага самалупцаваньня. Да антракту нават бляндынкі здагадаліся, што ён іграе вар’ята.

Не здагадаліся толькі аркестранты на сцэне. І ня толькі таму, што так прыдумала драматург Марыя Ладо. Таму што так прыдумаў рэжысэр Аляксандар Гарцуеў і сыгралі «купалаўцы».

Вось жывуць яны на сцэне гэтыя дзьве гадзіны свайго жыцьця. Вельмі розныя. Камусьці далі партнэра, зь якім яны граюць дуэт. Камусьці далі толькі адну рэпліку. Чыюсьці біяграфію (тата ў яго — прафэсар кансэрваторыі) мы пачуем. А чыюсьці — пабачым.

Вось сужонцы-валторны (Андрэй

Гладкі і Сьвятлана Зелянкоўская). Ён ажаніўся зь ёю здуру, па маладосьці: пераспаў у інтэрнаце, выпіўшы лішку. І цяпер ім наканавана ўсё жыцьцё ў адну дудку дудзець, то бок, вядома, у валторну: яна — кахаючы яго, ён — яе ненавідзячы. І дзяцей у іх няма. І яна спрабуе ўпіхнуць яму кіслы яблык (зусім наіўная біблійная асацыяцыя), кавалкі якога потым забіваюць муштук валторны і не даюць граць...

Вось цуд — глухі скрыпач (Генадзь Гарбук)! Яго трымаюць у аркестры зь літасьці: у яго нікога няма, акрамя сямігадовай унучкі, якую трэба ставіць на ногі. Але ён грае бяз фальшу, таму ягонай глухаты ніхто не заўважае. І калі ён сыходзіць, у руках у яго — аранжавы поліэтыленавы пакет: ён нешта набыў для сваёй дзяўчынкі. А што стала зь яе бацькамі, давайце ня будзем пытацца...

Вось правільны ва ўсіх сэнсах альтыст Кірпіч (бліскучая праца Аляксандра Падабеда). Ён ня п’е кавы, сьпіртнога, ня курыць — спажывае толькі зялёную гарбату. Ён ведае ўсё, што трэба ведаць да ягонага ўзросту. Ён — клясычны зануда, і таму яго ўсе ненавідзяць. І ён іх ненавідзіць. Таму што працоўны дзень мусіць скончыцца а 18.00, сонца мусіць уставаць на ўсходзе, а Волга — цячы ў Каспійскае мора. І аркестар — гэта не сям’я, а працоўнае месца, таварышы!

Гэта такі зрэз інтэлігентнага грамадзтва. Ну, ставяць спэктакль пра музыкаў — а маглі б і пра актораў. Сярод іх ёсьць габрэй (Алег Гарбуз) і паненка, што марыць пра выгодную партыю для шлюбу (Вікторыя Чаўлытка). Ёсьць рамесьнік, абыякавы да сваёй віялянчэлі (Аляксей Чарнігін), і вясёлы балбатун, што спэцыялізуецца на анэкдотах (Павал Яскевіч). І калі яны не забываюць, што ўвесь час знаходзяцца на сцэне, то за імі так цікава назіраць. За ўсімі! Нават за флейтыстам (Аляксандар Паўлаў), што вымаўляе ўсяго адну рэпліку: «Кастаправаў». Прозьвішча ў яго такое.

І вось у сьвет гэтых людзей, кожнага зь якіх мы бачылі ў сваім жыцьці — не на сцэне, а ў рэальным жыцьці — урываецца Моцарт. Так, так, вядома, — псых, што лічыць сябе Моцартам! Але тое, як яго грае Раман Падаляка, не пакідае сумневу: і Моцарт быў псыхам! Геній псыхам проста абавязаны быць! Таму што толькі вар’ят здольны зь першай жа хвіліны перакανаць вас, такога нармальнага і звычайнага, у тым, што ён мае рацыю (гл. у Эдгара По: «Лекавы сродак доктара Смалы і прафэсара Пер’е»). Таму што вар’ят хітры, вёрткі іператвараецца ў вас самога — стасуючыся з вамі. Увогуле, пастаўце дыягназ Моцарту — і можаце бегчы за мяжу, дзе вам, як аднаму гарадзенскаму псыхіятру, дадуць палітычны прытулак.

Яны ня проста вераць гэтаму геніяльнаму хлопчыку з вачыма, што сьвецяцца цяжкім псыхічным захворваньнем. Яны ўлюбляюцца ў яго і хіба што толькі не ўсынаўляюць яго — як узвод капітана Янакіева ўсынавіў мурзатага Ваню Сонцава, зрабіўшы яго сынам палку. Гэта бачна з таго, як мяняецца стаўленьне да яго ў супольнага «таты» — патомнага канцэртмайстра скрыпак (Уладзімер Рагаўцоў): першапачатковы скепсіс саступае месца шчырай павазе. І супольная «мама» — арфістка (вельмі цёпла грае свой эпізод Алена Іваньнікава) дае яму каву — не ад падхалімства, а ад дабрыні: хлопчык стаміўся з дарогі, а тут такія скразьнякі... І з валтарністам Юрам ён будзе гаварыць пра тое, як важна нарадзіць сына, каб усё ў цябе наладзілася ў жыцьці. А зь літаўрыстам Жорам (Павал Яскевіч) глыне каньяку з кавай, каб сьвет здаўся такім каляровым і такім душэўным...

Вось былі яны такія розныя. І яднала іх толькі месца працы. А цяпер зьявіўся супольны сын, унук, брат, любімы — няхай і вар’ят, няхай! Важна тое, што цеплыні ў жыцьці кожнага зь іх стала крыху больш! І зьявілася музыка, якой раней не было. Былі толькі нотныя знакі, адсюль дасюль. Тут граем — тут ня граем. Дысцыпліна была.

А зьявілася — музыка!!!

І толькі адзін не паддаецца — ну якая ж гісторыя пра Моцарта без свайго Сальеры?!

Альтыст Валуеў (Ігар Дзянісаў) абмаляваны акторам настолькі дакладна і пераканаўча, што самы час многім нашым сучасьнікам паглядзець у люстэрка. Вось ён стаіць, саракадзевяцігадовы здаровы мужык, у замшавай куртцы, што выйшла з моды, з фрызурай a la Джон Ленан, у акулярах-хамэлеонах (каб ніхто ў душу ня лез бруднымі ботамі). Ён быў пяць разоў жанаты (прычым два разы — з адною і тою ж дурніцаю). Ён марыў граць у «Бітлз», ну, прынамсі, — дарасьці да вядомасьці Башмета. Ён ведае, што ён — геній! А гібее ў правінцыйным аркестры, бяз званьня і ўзнагародаў. А калі дапусьціць, што тата і мама ў яго таксама былі музыкамі, і тата граў у тым самым аркестры, а мама — у суседняй багадзельні-філярмоніі, то, Божа, як жа ён мусіць ненавідзіць і гэтую прафэсію, і самога сябе ў прафэсіі і безь яе, і гэтага саплівага шызоіда, што разыгрывае ролю генія! Мастацтва скончылася! Моцарта — не было! Чуеце выыыыыыыыыыыыыыыыыыыыы?

Ня цыніка грае Ігар Дзянісаў, а глыбока няшчаснага чалавека. Калі ў самым пачатку спэктаклю ён зьняў кубачак з гарбатай з уласнага альта (!) — калі толькі гэта не выпадковасьць, то гэтым усё сказана...

І мастацтва праходзіць паўз яго, і каханьне (Юлія Шпілеўская выдатная ў ролі гатовай ахвяраваць сабой віялянчэлісткі Наташы) ён ледзьве не праміргаў (дурань, дурааань...) І трэба толькі паглядзецца ў люстэрка, каб пазнаць у ім — сябе.

Кожнаму — сябе.

Вось ён — дыплямат, адкліканы з замежжа, які на старасьці год заводзіць сабе блог, каб не адчуваць сябе выкінутым на сьметнік.

Вось ён — артыст, улюбёнец публікі, на чатыры гады выбраны дэпутатам, а далей — куды вяртацца? — маладыя вырасьлі!

Вось ён — журналіст, пазбаўлены газэты, мастак, карціны якога не купляюцца, рок-сьпявак, якому не даюць выступаць перад публікай, прафэсар, што не дамогся нават чвэрткі стаўкі лябаранта на былой катэдры, філёляг, што так і не абараніў дысэртацыю...

Гэта — мы.

Жыцьцё мінае, як быццам цябе зьвязалі і адвезьлі ў вар’ятню санітары, адзін зь якіх па чарзе з Моцартам дырыжуе гэтым утрапёным аркестрам жыцьця. А хочацца, каб паднялася заслона, выйшлі музыкі ў зялёных касьцюмах канца XVIII стагодзьдзя і малады геніяльны Маэстра загадным тонам спытаў:

— Альт! А Вам што — пэрсанальнае запрашэньне да жыцьця трэба? Жывіце ў радасьці!

...І загучыць саракавая сымфонія. Памятаеце — струнныя там, у самым пачатку?

Гэта і ёсьць — вар’яцтва любові да чалавецтва, да сьвету, да жыцьця! Жывіце ў радасьці!

**Аляксандар Фядута, глядач**

# Юрыст напісаў кнігу пра Забэйду

Мноства навуковых кніжак напісана ненавукоўцамі, мноства перакладаў зроблена людзьмі, якія не скончалі факультэту замежных моваў. Гэтаксама і з гэтай кніжкай пра Міхася Забэйду-Суміцкага «Песьняй даваў людзям радасьць», выдадзеную ў сэрыі «Нашы славутыя землякі». Такая кніга пабачыла сьвет толькі цяпер, праз 26 гадоў пасьля сьмерці Забэйды. І напісаў яе не музыказнаўца, а юрыст з Баранавічаў Алесь Горбач.

Я быў сьведкам, як паўставала гэтая кніга, як у вольны час Алесь на электрацы ехаў у Менск і сядзеў у архівах. «Я стаўся сучасьнікам, нават сваяком Забэйды — ведаю гэтулькі падрабязнасьцяў ягонага жыцьця. Гэтак уцягнуўся ў працу над кнігай», — кажа аўтар.

Аўтар нарадзіўся на Ружаншчыне, у суседняй праз рэчку вёсцы ад той, дзе некалі жыў сьпявак. Старыя з ваколіц яшчэ памятаюць прыезды Забэйды на Бацькаўшчыну і бясплатныя выступы ў сялянскіх хатах. Каб адчуць асяродзьдзе,



у якім жыў Забэйда, аўтар кнігі наведаў і Прагу, папрацаваў у чэскіх архівах. А самае галоўнае, прывёз на магілу Забэйды жменьку пясочка з магілы маці сьпевака, якую ён вельмі любіў, але апошні раз бачыў падчас вайны.

У кнізе зьмешчаны жыцьцяпіс нашага сьпевака, падазеныя невядомыя раней факты з бурлівага жыцьця песьняра. Сабранае ў адно цэлае тое, што драбінкамі друкавалася па розных выданьнях. Шмат цікавых і не друкаваных раней фатаздымкаў.

Магчыма, некалі пасьля зьявяцца больш ёмістыя дасьледаваньні пра Забэйду-Суміцкага. Але спасылацца яны будуць на гэтую, першую, кнігу, што сталася яшчэ адной кладачкай да вяртаньня нашага славутага сьпевака зь небыцьця.

**Руслан Равяка**

**Горбач А. Песьняй даваў людзям радасьць.** — Менск: Тэхналёгія, 2007.

## СЬЦІСЛА

### «Чорная котка, белы кот» па-беларуску

Хутка выйдзе дубляваная па-беларуску стужка Эміра Кустурыцы. На «агучку» была атрыманая ліцэнзія і прадавацца дыскі з «Чорнай коткай…» будуць у афіцыйна. Пераклад рабіў выпускнік філфаку Віталь Зыблюк, тэкст рэдагаваў паэт Андрэй Хадановіч, лідэр гурту «Палац» Алег Хаменка пагадзіўся агучыць ролю цыганскага барона, другога барона агучваў лідэр гурту Neuro Dubel Аляксандар Кульлінковіч.

### «Беларуская вясна» зноў у Кіеве

У праграме фэстывалю, што пройдзе з 22 сакавіка да 12 красавіка, — вулічны пэрформанс, кінапаказы, вечар флэш-анімацыі, выстава фотаздымкаў і СМІ Беларусі, круглы стол мэдыямэнэджэраў, канцэрт этнагуртоў і ўкраінска-беларуская літаратурная вечарына. Лягатыпам фэстывалю стаў падводны човен колераў нацыянальнага сьцягу Беларусі — белага, чырвонага й белага.

### Кніга пра Адольфа Клімовіча

Напісаў кнігу «Нашчадак слаўных крывічоў» маладэчанскі краязнаўца Міхась Казлоўскі. Адольф Клімовіч нарадзіўся ў 1900 г. у в. Казаноўшчына Сьвянцянскага павету Віленскай губэрні (цяпер Астравецкі раён), вучыўся ў Празе, большую частку жыцьця пражыў у Вільні, пахаваны ў Клюшчанах. Быў адным з кіраўнікоў беларускай Хрысьціянскай дэмакратыі і Беларускага інстытуту гаспадаркі і культуры. У кнізе паказаная яго выключная роля ў стварэньні масавага незалежніцкага руху ў Заходняй Беларусі ў 20—30-я XX ст.

**Паводле «Рэгіянальнай газеты», радыё «Рацыя», belarus.org.ua**

### Купіце палац

Палац у Сьвяцку, што пад Горадняй, імкліва разбураецца: адвальваецца тынкоўка, расьцярушваюцца сьцены… Палац мае агромністую архітэктурную каштоўнасьць. Яго збудаваў у 1779 годзе італьянскі архітэктар Джузэпэ Сака. Каміны, жырандолі, вазоны для кветак, мэбля — рабілася паводле ягонага эксклюзіўнага праекту. Палац быў аздоблены багатай ляпнінай. У 1930-х гадах тут была створаная адзіная на той час у Польшчы наркалягічная лякарня. Да 2005 г. тут месьцілася сухотная лякарня. Але як толькі мэдычная ўстанова пакінула палац, ён пачаў разбурацца. Грошай на рэстаўрацыю няма.

Таму палац і сабраліся выставіць на аўкцыён. Першапачатковы кошт — 1,5 мільярда рублёў — напалохаў пакупнікоў. Ім падалося, што за палац не ў найлепшым стане гэта зашмат. Таму цяпер у Сьвяцак накіравалася адмысловая дзяржаўная камісія, якая мусіць яшчэ раз ацаніць кошт палацу.

### Хатнік Шалкевіча ў Карэлічах

У Карэлічах канцэрт вядомага барда Віктара Шалкевіча быў зладжаны ў прыватнай хаце аднаго з карэліцкіх актывістаў. На паўтарагадзінным канцэрце прысутнічалі 27 чалавек. Сьпявак прапанаваў публіцы свае найлепшыя, ужо добра вядомыя песьні.

### Акудовічавы «Дыялёгі з Богам» цяпер і па-польску

У Польшчы выйшла ў сьвет 168-старонкавая кніга Валянціна Акудовіча «Dialogi z Bogiem». Дыхтоўна афармленая, у цьвёрдай вокладцы, яна працягвае сэрыю выданьняў беларускай літаратуры, зладжаную Калегіюмам Усходняй Эўропы. На польскую мову тэкст пераклалі Галіна і Ян Максімюкі.

### П’еса Петрашкевіча пра БНР

Напярэдадні 25 Сакавіка Згуртаваньне беларусаў сьвету выпусьціла новую п’есу Алеся Петрашкевіча «Приласкать и уничтожить». У п’есе драматург закранае гісторыю станаўленьня нашай дзяржаўнасьці. Пабачыць кнігу можна на сядзібе БНФ і knihi.net.

### На Вялікдзень — жывая трансьляцыя з Ватыкану

Тэлеканал «Лад» будзе ўпершыню трансьляваць велікодныя мерапрыемствы з удзелам папы Бэнэдыкта XVI. 21 сакавіка а 22.10 пачнецца жывая трансьляцыя Хроснага ходу ля рымскага Калізэю на чале зь сьвятым айцом.

**СМ; Польскае радыё для замежжа, milinkevich.org, naviny.by**

## Лётчык «Люфтвафэ» баіцца, што гэта ён зьбіў Сэнт-Экзюпэры

88-гадовы Хорст Рыпэрт прызнаўся, што менавіта ён вінаваты ў сьмерці францускага пісьменьніка. Рыпэрт распавёў, што 63 з паловай гады таму ён зьбіў самалёт, у якім знаходзіўся Сэнт-Экзюпэры.

Як вядома, 31 ліпеня 1944 г. Антуан дэ Сэнт-Экзюпэры, які служыў у ваенна-паветраных сілах Францыі, вылецеў з аэрадрому на Сардзініі ў выведвальны палёт курсам на Марсэль. Больш яго ня бачылі.

Выказваньні Рыпэрта пацьвярджаюцца зьвесткамі зь некалькіх крыніц. Напрыклад, запісамі радыёперахвату перамоваў францускіх аэрадромаў, якія ажыцьцяўлялі нямецкія войскі.

У той жа час сьцьверджаньні нямецкага пілота супярэчаць іншым вэрсіям. У журналах Люфтвафэ не было знойдзена запісаў пра самалёт, зьбіты ў той дзень у мясцовасьці, дзе зьнік аўтар «Маленькага прынца». Знойдзеныя ў 2003 г. на марскім дне парэшткі самалёта ня мелі яўных сьлядоў абстрэлу. Былі меркаваньні пра няспраўнасьці зьнішчальніка, на якім лётаў Сэнт-Экзюпэры, і нават вялося пра магчымае самагубства пісьменьніка.

На момант гібелі вялікаму гуманісту было 44 гады, ён перажыў некалькі аварый, пакутаваў на болі ад старых ран і пакутаваў ад дэпрэсій. Незадоўга да фатальнага дня Сэнт-Эксу наогул забаранілі лётаць, але без палётаў ён ужо ня мог.

Францускія дасьледчыкі сьцвярджаюць, што самалёт увайшоў у ваду на вялікай хуткасьці і амаль вэртыкальна. У момант сутыкненьня з вадой адбыўся выбух. Абломкі раскідала пад вадой на вялікай адлегласьці. Не было знойдзена ніводнай часткі чалавечага цела.

Адзіная рэч Сэнт-Экзюпэры, што ацалела ў катастрофе, — срэбны бранзалет, на якім было выгравіраванае імя пісьменьніка, імя ягонай жонкі і нью-ёрскі адрас выдаўца, што выпусьціў «Маленькага прынца».

## На вуліцах Менску пад бел-чырвона-белымі сьцягамі

У сталіцы здымаецца фільм пра пачатак 1990-х. У суботу прайшоў пастановачны мітынг: людзі з плякатамі «Мы — беларусы» ды бел-чырвона-белымі сьцягамі абступілі старамодны ЗІЛ насупраць помніка Леніну ля прахадной Менскага электрамэханічнага заводу.

## Дырэктарат у плаўках

У суботу кіраўнікоў жодзінскіх прадпрыемстваў абавязалі ўдзельнічаць у спартовых спаборніцтвах. Кіраўнікам выдасца шанец паспрабаваць сябе ў плаваньні, настольным тэнісе, валейболе, дартсе і шашках.

## Менск застанецца бяз хат

Неўзабаве з аблічча Менску можа зьнікнуць амаль уся драўляная забудова. У новым генэральным пляне разьвіцьця гораду яе застанецца толькі 3—4 %. Зьнясуць вёску Дружба на ўезьдзе ў горад з боку Берасьця, Пасёлак трактарабудаўнікоў у Партызанскім раёне, адна- і двухпавярховыя пабудовы на вул.Арлоўскай, Усходняй. Горад бярэ на сябе абавязацельства зьнесьці старыя дамы, даць людзям жытло і толькі пасьля пусьціць на гэтую тэрыторыю інвэстара. Галоўная праблема, зь якой сутыкнуцца архітэктары, — адсяленьне жыхароў.

## Таксіст зьбіў школьніка на пераходзе

Школьнік ішоў на зялёнае сьвятло. У выніку здарэньня дзіця атрымала чэрапна-мазгавую траўму і было шпіталізаванае ў бальніцу хуткай дапамогі. Вадзіцель затрыманы на месцы, на яго складзены пратакол аб адміністрацыйным правапарушэньні.

## Маланка раскідала хату

У вёсцы Сініцічы Камянецкага раёну маланка трапіла акурат у комін дому 41-гадовага вяскоўца. Ад выбуху хата абрынулася. Шпалеры асмаліліся, цалкам расплавілася праводка, але пажар ня ўсчаўся. Гаспадара, які быў у ложку, выратавала сьцяна, якая не дала бэлькам зваліцца на яго.

## Над ёй прайшоў цягнік, а яна не прачнулася

Машыніст дызэль-цягніка Берасьце—Забалацьце пасьпеў заўважыць толькі белыя красоўкі, але было позна, нават экстранае тармажэньне ня спыніць цягнік імгненна. Над жанчынай прайшлі тры вагоны. Зьбегліся людзі, выклікалі «хуткую». А «гераіня» нават не прачнулася. Яе расштурхалі, памалу выцягнулі з-пад саставу і ўпэўніліся, што дама жывая і здаровая. Чыгуначнікі і міліцыянты ў шоку, а «пацярпелай» хоць бы што.

## Маці напаіла 4-гадовага сына перакісам

Жыхарка адной зь вёсак Астравецкага раёну па неасьцярожнасьці напаіла свайго малога 30-працэнтным растворам перакісу вадароду. Дзіця, выпіўшы каля 50 грамаў вадкасьці, сканала. Падчас допыту 28-гадовая жанчына, якая працуе цырульніцай, растлумачыла, што паблытала перакіс зь дзіцячым харчаваньнем.

**Паводле БелаПАН, «Звязда», радыё «Рацыя», BulletinOnline.org, «Рэспубліка», БЕЛТА, СТВ**



PHOTO.BYMEDIA.NET

**На тыдні ў краіне — ад мінус да плюс дзесяці. Беларусь знаходзіцца пад узьдзеяньнем халоднага паветра паўночных шырот. Магчымы кароткачасовы сьнег, галалёдзіца. Уначы 2—8 градусаў ніжэй за нуль, пры праясьненьнях тэмпэратура можа ўпасьці да мінус 10. На выхадных крыху адпусьціць: у нядзелю, 23 сакавіка, па поўдні магчымае пацяпленьне аж да +10.**

# ФАРБАВАНКА-МАЛЯВАНКА

## Зрабі бацькам падарунак да Дня Волі - расфарбуй "Пагоню"!





Капітан Танака ©

http://www.tanakaland.org




ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

## ВЫСТАВЫ

**Herbarium Amoris**

**У Нацыянальным музэі гісторыі і культуры да 13 красавіка** працуе фотавыстава Эдварда Коінбэрга Herbarium Amoris — «Гербары каханьня», прысьвечаная 300-годзьдзю з дня нараджэньня Карла Лінэя. Цыкль фатаздымкаў Эдварда Коінбэрга «Гербары каханьня» быў упершыню паказаны ў Стакгольме ў 2003 г. Коінбэрг стварае фатаздымкі расьлін у стылі, які адсылае гледача да часоў Лінэя ці нават да яшчэ ранейшых. Істотная крыніца натхненьня фатографа — галяндзкі жывапіс XVII—XVIII стст.

**Рыгор Сітніца**

**У Нацыянальным мастацкім музэі да 10 красавіка** працуе выстава мастака-графіка Рыгора Сітніцы. Дэманструюцца творы, выкананыя ў 1980-2000-х. Сярод іх такія вядомыя сэрыі, як «Нясьвіж», «Формула мінулага», «Менск. Верхні горад» і іншыя.

## КАНЦЭРТЫ

**Вечарына, прысьвечаная Каліноўскаму**

**21 сакавіка на офісе БНФ** — канцэрт-вечарына, прысьвечаная Кастусю Каліноўскаму. **Пачатак а 18-й.**

## ТЭАТРЫ

**Купалаўскі тэатар**

**21 (пт)** — «Вольга»
**22 (сб)** — «Вечар»
**23 (ндз)** — «Макбэт»
**24 (пн)** — «Я не пакіну цябе»
**26 (ср)** — «Сымон-музыка»
**28 (пт)** — «Чычыкаў»
**29 (сб)** — «Ромул Вялікі»
**30 (ндз)** — «Сны аб Беларусі»
*ранішія спэктаклі*
**23 (ндз)** — «Сьнежная каралева»
*малая сцэна*
**22 (сб)** — «Дзікае паляваньне караля Стаха»
**24 (пн)** — «Салямэя»
**26 (ср)** — «Варшаўская мэлёдыя»

**Тэатар беларускай драматургіі**

**21 (пт)** — «Адвечная песьня»
**22 (сб)** — «Казачкі з куфэрачка»
**23 (ндз)** — «Прыгоды маленькай ведзьмы»
**23 (ндз)** — «Белы анёл з чорнымі крыламі»
**24 (пн)** — «Ігвіта, альбо Як гэта рабілі ў Францыі»
**25 (аўт)** — «Містэр розыгрыш»
**26 (ср)** — «Нязваны госьць»
**27 (чц)** — «Чорны квадрат»
**28 (пт)** — «Палёты з анёлам»
**29 (сб)** — «Кабала сьвятошаў»
**30 (ндз)** — «Воўк-мараплавец»
**30 (ндз)** — «Неба ў дыямэнтах»
*На сцэне РДК Прафсаюзаў (пр.Незалежнасьці, 25)*
**26 (ср)** — «Адэль»

## КІНО

**Вуснае кіно**

**У Музэі гісторыі беларускага кіно (Сьвярдлова, 4) 22 сакавіка а 15-й** — поўнамэтражныя фільмы: «Герой». Рэжысэр Ігар Корзун. «Мядзьведзь і Охо». Рэжысэр Зьміцер Строцаў.

## КІНАФАРМАТ 4x4

# «Маўклівае сьвятло»

**Маўклівае сьвятло** (Stellet licht)

Мэксыка — Францыя — Нідэрлянды, 2007, каляровы, 127 хв.

**Рэжысэр:** Карлас Рэйгадас

**Ролі выконваюць:** Элізабэт Фэр, Якаб Клаасэн, Марыя Панкрац, Мірыям Тойз, Карнэлія Ўол

**Жанр:** Рэлігійна-мэтафізычная драма

**Прэміі:** Прыз журы Канскага кінафэсту, намінацыя на «Залатую галіну» Канскага фэсту, прыз МКФ у Бэргене, прыз Чыкагаўскага кінафэсту, прызы Гаванскага фэсту за рэжысуру, апэратарскае майстэрства, гук — усяго 18 узнагародаў і 1 намінацыя

У Мэксыцы жыве ізаляваная абшчына мэнанітаў. Гэта нашчадкі галяндцаў, якія гавораць архаічнай мовай і рупліва захоўваюць традыцыйны лад жыцьця.

Набожны Ёхан, узорны муж і бацька шматдзетнай сям'і, закахаўся ў гаспадыню кавярні Марыяну. Але адультэр ёсьць парушэньнем Божага Запавету…

Мэксыканскі рэжысэр Карлас Рэйгадас — адзін з самых цікавых творцаў сучаснасьці. Рэйгадас спрабуе ўбачыць у жыцьці Боскае і ўвасобіць на экране. І хаця папярэдняя стужка Рэйгадаса «Бітва на нябёсах» атрымалася рызыкоўна-блюзьнерскай, карціна «Маўклівае сьвятло» абяцае куды больш аскетызм і куды меншую блытаніну.

У фільме здымаліся непрафэсійныя акторы, для якіх паказаны лад жыцьця натуральны; камэра звышдоўга ўглядаецца ў дэталі й пэйзажы (адна сцэна ўзыходу сонца доўжыцца пяць хвілін).

Прагляд карціны патрабуе засяроджанасьці і ўвагі.

Рэйгадас прытрымліваецца мэтаду Таркоўскага і ў яшчэ большай ступені, суворага аскета Карла Дрэйера. Апошняя сцэна «Маўклівага сьвятла» — уваскрашэньне, занядбанае ў сучаснай мітусьлівай сумятні.

**Андрэй Расінскі**

# Моцарт, сын палка

Адзін сэзон у Купалаўскім. Пра спэктакль «Маэстра» піша Аляксандар Фядута. Старонка 26.



ЮРЫ БУДЗЬКО

## КАЛІ Б...

...МУС настойвала на тым, што дзеяньні ДАІ, якія прыпынілі п’янага ліхача з дапамогай «жывога шчыта», былі слушнымі.




МАЛЮНАК І ТЭКСТ ЛЕЛІКА УШКІНА

— Я вам зараз на прыктыцы пакажу, што мог нарабіць п’яны за рулём, каб не «жывы шчыт»!

# А ты падпішыся!

**Каб рэгулярна атрымліваць «Нашу Ніву»,** проста паведаміце ў Рэдакцыю свой адрас. Дэталі — **старонка 17.**

## ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ

### ВІТАНЬНІ

**Свае 80 народзіны** сьвяткуе цудоўны Чалавек і Беларус Юрка Станкевіч, сын доктара Янкі Станкевіча, заснавальнік Беларускай Клюбоўні ў Празе, аніматар беларускага жыцьця ў Чэхіі. Моцнага здароўя, дзядзька Юрка! Віншаваньні дасылайце сюды: jirstan@login.cz

**Віншую Грычанок Вольгу** з Днём народзінаў! Зычу шчасьлівай долі, моцнага каханьня, надзеі і волі. Няхай заўжды сьвеціць сонца ў тваё аконца. Дзякуй за тое, што ты ёсьць. Сп.Андрэй

### ЖЫТЛО

**Прадам сядзібу** ў засьценку Селішча Карэліцкага раёну. Т.: (029) 583–37–40

**Маладая беларускамоўная сям’я** зь дзіцем 6 гадоў здыме адносна таннае прыстойнае жытло ў Менску альбо пад Менскам (каб часта хадзілі электрацыя ці аўтобус). Разглядаюцца ЎСЕ варыянты. Т.: (029) 198–32–51

### ПРАЦА

**Якасна выканаю** пісьмовыя працы па беларускай гісторыі, літаратуры, мове. Зьвяртацца загадзя. Т.: (029) 101–03–24. Юрась

**Якасны набор**, рэдагаваньне тэкстаў на беларускай мове. Зьвяртацца загадзя. Т.: (029) 101–03–24. Юрась

### ВАШ РОД

**Дапаможам праверыць** шляхетнасьць Вашага роду. Рэканструкцыя фамільнага гербу. Т.: (029)753–91–96, для лістоў: а/с 195, 220030, Менск, Беларусь. alesknigi@mail.ru

### КНІГІ, ЗАПІСЫ

**Відэазапіс—рыцарскія фэсты.** Кнігі — Цітоў «Геральдыка Беларусі», Чэкалаў «З гісторыі шляхты ў Беларусі і суседніх дзяржавах», Залівака «Генэалёгія Беларусі...», «Гісторыя роду Залівакі», інш. Камплект значак «Гарады Беларусі» (зацьверджаныя Магдэбурскім правам), маркі з гістарычнай сымболікай. Аўдыё. Часопіс «Новая Эўропа». Сучасныя кнігі («Кнігарня «НН») «Тэксты» (апошні–6), «Фрагмэнты», 7, 8, 9, «Тазік Беларускі». Шукаем кнігі па беларусістыцы, гісторыі. Т.: (029)753–91–96, для лістоў: а/с 195, 220030, Менск, Беларусь. alesknigi@mail.ru

## «НН» СТО ГАДОЎ З ВАМІ

У Амэрыцы для працоўнага народу насталі дрэнныя часы. Як пачаўся «крызіс», банкруцтва, — шмат фабрык і заводаў пазакрывалася, і вельмі многа людзей асталося бяз працы і бяз хлеба. Цяпер, — як піша «Слово» — «у Злучаных Штатах ня маюць заробку аж *чатыры мільёны семсот пяцьдзесят тысяч работнікаў*»!

**«Наша Ніва». №11. 1908**


**Наша Ніва**

незалежная газэта

заснаваная ў 1906, адноўленая ў 1991

**галоўныя рэдактары «Нашай Нівы»:**
З.Вольскі (1906), А.Уласаў (1906—1914), Янка Купала (1914—1915), А.Луцкевіч, У.Знамяроўскі (1920), С.Дубавец (1991—2000).

сакратарка рэдакцыі — Наста Бакшанская
шэф–рэдактар — Андрэй Дынько
галоўны рэдактар — Андрэй Скурко
мастацкі рэдактар — Сяргей Харэўскі
заснавальнік — Мясцовы фонд выданьня газэты «Наша Ніва»
выдавец — Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы»



**АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ:**
**220050, Менск, а/с 537**
**Tel/fax: (017) 284-73-29, 8-029-613-32-32, 8-029-707-73-29.**
**E-mail: nn@nn.by**
**On-line: www.nn.by**


© **НАША НІВА**. Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая. 12 палос фарматам А2, 6 друк. арк. Друкарня РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». Менск, пр. Ф.Скарыны, 79. Рэдакцыя не нясе адказнасьці за зьмест рэклямных абвестак. Кошт свабодны. Пасьведчаньне аб рэгістрацыі пэрыядычнага выданьня №581 ад 4 ліпеня 2002 г., выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Юрыдычны адрас: 220101, г. Менск, пр. Ракасоўскага, 102–71. Р/р 3012206280014 у МГД ААТ «Белінвестбанк», Менск, код 764.

Наклад &&&. Газэта выдаецца 48 разоў на год.

Нумар падпісаны ў друк 23.00 19.03.2008.

Замова № &&&.

Рэдакцыйны адрас: Ракасоўскага, 102–71.